КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 45 (221) ◂ 10 снежня ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



## АПАНТАНАСЦЬ ЭТНАСАМ

Стар. 6

## ПА КІМ ЗВОНІЦЬ ВЕЧАВЫ ЗВОН

За выкананне Канстытуцыі ў нашай краіне можна нарвацца на вялікія непрыемнасці

Стар. 4

## ЦІ ТРЭБА БАЯЦЦА ЧАЙНА-ТАЎНАЎ

Чайна-таўны — не статычная з'ява. Яны як жывыя арганізмы: паміраюць, рухаюцца, адраджаюцца

Стар. 13

## ФЕНОМЕН МАСТАКА ФЕРДЫНАНДА РУШЧЫЦА

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

## КРЫЖ РАСЦІСЛАВУ ЛАПІЦКАМУ

Нарыс Тацьцяны Уласенкі з цыклу «Шматпакутныя крыжы Беларусі»

З НАГОДЫ

# НАРОДНЫ ДЛЯ АБРАНЫХ

Вольга ХВОІН

**Два дні ў цэнтры Мінску быў амаль заблакаваны рух. Подступы да Палаца Рэспублікі, дзе праходзіў чацвёрты Усебеларускі народны сход з удзелам Аляксандра Лукашэнкі, ахоўваліся ад саміх жа беларусаў, быццам там якраз і знаходзіўся знакаміты «крыштальны сасуд».**




Пасля двухтыднёвага «разгулу дэмакратыі» на БТ у выглядзе выступаў і дэбатаў кандыдатаў у прэзідэнты аўру дзяржаўнай стабільнасці два дні падпраўлялі трансляцыямі з чацвёртага Усебеларускага народнага сходу, шматгадзіннымі выступамі кіраўніка Беларусі. Трэба сказаць, што вызначэнне «народны сход» не ўплывае на даступнасць удзелу ў ім простых смяротных. Прычым як на стадыі адбору ўдзельнікаў, так і падчас самога мерапрыемства. Сёлета паэт-палітык Уладзімір Някляеў дарэмна марнаваў рэсурсы, збіраючы тысячы подпісаў за свой удзел ва Усебеларускім сходзе, як і былы рэктар, кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Казулін свае фізічныя і маральныя сілы пяць гадоў таму. Народны сход закрыты для народа.

Удзел у ім дзвюх з паловай тысяч чалавек хіба што нагода паставіць гачык насупраць пункту «я бачыў прэзідэнта» ды дапамагчы разгрузіць склады айчынных вытворцаў гадзіннікаў, мікрахвалёвак, скураных партфеляў. Шматгадзінны выступ Аляксандра Лукашэнкі ніякай крытыкі з боку дзвюх з паловай тысяч прысутных не выклікаў. Ідэальная згода і паразуменне.

Напрыклад, было адзначана, што павышаць узровень эканомікі і жыцця людзей перашкодзіў глабальны крызіс, але «не ў нас ён зарадзіўся», што ў гэтым вінаваты Захад, дзе «выдатнае жыццё не мела пад сабой цвёрдай эканамічнай асновы». «Я першапачаткова гаварыў тады, што чыннікамі крызісу сталі карупцыя, махінацыі, сквапнасць эканамічных і палітычных эліт краін-флагманаў. Сёння з гэтай пазіцыяй пагадзіліся ўсё», — адзначыў сваю празорлівасць Лукашэнка. І чаму фінансавыя недарэкі з Уол-стрыт не прыслухоўваліся да Аляксандра Лукашэнкі?! Цяпер Беларусь вымушана змагацца з наступствамі крызісу, а несумленныя «партнёры», якія «зачынялі свой унутраны рынак для нашай прадукцыі, у разы павялічвалі кошты на нафту і газ», спрыялі таму, што краіна была ўцягнутая ў гэты вір.

«За мінулыя пяць гадоў мы зрабілі каласальны рывок у сацыяльна-эканамічным развіцці краіны. Нягледзячы ні на якія цяжкасці, мы выканалі тое, што абяцалі народу на папярэднім сходзе», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Аднак у плане сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступныя пяць гадоў гаворыцца, што «не атрымалася ў поўнай меры вырашыць шэраг праблем, якія стрымліваюць дынаміку сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны». У прыватнасці «захавалася недастаткова эфектыўная структура эканомікі, што выяўляецца ў высокіх імпартаёмістасці, матэрыялаёмістасці і энергаёмістасці выпускаемай прадукцыі, адносна нізкай прадукцыйнасці працы і, як вынік, недастатковай канкурэнтаздольнасці прадукцыі айчыннай вытворчасці. Зніжаецца эфектыўнасць інвестыцый і павольнымі тэмпамі павялічваецца аб'ём прыцягнення ў эканоміку прамых замежных інвестыцый. Слабой застаецца ўспрымальнасць прадпрыемстваў і арганізацый да інавацый. Па-ранейшаму назіраецца незбалансаванасць у знешнім гандлі».

Лукашэнка не прамінуў і закрануць апазіцыйных кандыдатаў у прэзідэнты. «Выслухаў альтэрнатыўных кандыдатаў. Сярод іх няма розніцы, усе аднолькавыя. Самы чэсны сярод іх — гэта прадстаўнік БНФ Рыгор Кастусёў. Ён ведае, што супернацыяналізм не пройдзе, а ўсё адно выходзіць з бел-чырвона-белым сцягам, гаворыць па-беларуску, хоць яго ніхто не разумее. Усе астатнія ўжо прапанулісь», — сказаў кіраўнік дзяржавы, нагадаўшы пра новага ворага Беларусі — Расію і пра тое, што некаторыя з гэтых кандыдатаў «фінансуюцца Расіяй».

Цікава, што Лукашэнка сказаў пра мову тытульнай нацыі як незразумелую людзям і адначасова запэўніў, што моўнае пытанне можна ў любы момант вырашыць: «Калі вы хочаце, каб мы размаўлялі на беларускай мове, мы зробім гэта заўтра ці потым».

Розніцу словаў і дзеянняў Лукашэнкі пацвердзіў інцыдэнт, што адбыўся падчас правядзення Усебеларускага народнага сходу. Група жанчын, што пацярпелі самі ці іх блізкія ад несправядлівасці судоў, мітынгавала паблізу Палаца Рэспублікі, дамагаючыся патрапіць на «народную» сустрэчу з Лукашэнкам. Але далей праходной Палаца Рэспублікі яны не прайшлі. Затое Аляксандр Рыгоравіч з гэтай нагоды выказаўся ў стылі «справядлівага барына». «Учора жанчына мітынгавала, скардзілася на судовыя органы. Папрашу, каб гэтыя пытанні былі перададзены генпракурору. Мне даводзілася папраўляць і судовыя органы ўлады», — пахваліўся сваёй усюдыіснасцю беларускі палітык.

У першы дзень Усебеларускага народнага сходу альтэрнатыўную сустрэчу каля чыгуначнага вакзалу правялі кандыдаты ў прэзідэнты Андрэй Саннікаў і Уладзімір Някляеў. На сустрэчу з кандыдатамі, якая перарасла ў мітынг, прыйшло прыблізна столькі ж людзей, як і на Усебеларускі сход. Але «ўваход» туды быў свабодны, і палітычныя лідэры пакуль што даступныя для грамадзян. Падчас гэтага мітынгу Някляеў яшчэ раз заклікаў прыйсці 19 снежня на Кастрычніцкую плошчу Мінска, запэўніўшы, «ёсць сцэнар плошчы 19 снежня, у нас усё прадумана штохвілінна». Праўда, кіраваць парадам, у адрозненні ад Усебеларускага сходу, будзе не адзін чалавек, а кагорта кандыдатаў, таму што дамовіцца аб «адзіным» ці супольным зняцці не атрымліваецца.

АКЦЫЯ

# ФЛЭШ-МОБ ПА-ГРАМАДЗЯНСКУ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Актывісты кампаніі «Грамадзянін» правялі ў Мінску акцыю «Фота-Беларусь». Яны фатаграфавалі мінакоў на фоне стэнда з контурамі Беларусі. А потым змяшчалі іх здымкі на сімвалічнай мапе.**

Другі здымак уручаўся ўдзельніку фотасесіі на памяць. На стэндзе значыўся надпіс: «Краіну стварае не ўлада. Краіну ствараюць грамадзяне!». «Сэнс акцыі — паказаць, што наша краіна складаецца не з чыноўнікаў, не з палітыкаў, а з грамадзян. І кожны з нас стварае Беларусь. Менавіта грамадзяне вырашаюць, якой Беларусь павінна быць», — патлумачыў актывіст кампаніі Мікіта Красноў.




Шлях мінчукоў пралягаў на Камароўскі рынак. Але нягледзячы на гаспадарскія справы, яны даволі ахвотна пазіравалі. «Усё залежыць толькі ад нас, — лічыць страхавы агент Наталля Гарачка. — Калі людзі гавораць: «Ой, мы не верым, што штосьці можна змяніць. Усё роўна будзе Лукашэнка», я ім кажу: «Усё залежыць ад вашых думак. Як вы думаеце, так і будзе. Хочаце быць статкам, які заганяюць у стойла ці бязвыхаднае становішча — будзьце. Але потым не плачце. Хочаце быць асобай, калі ласка, ідзіце і выказвайце сваю думку адкрыта».

Пенсіянерка Тамара Барысенка таксама пакінула свой здымак на мапе Беларусі. «Моладзь хоча паказаць, што калі мы ўсе разам збяромся, то нешта зможам і зрабіць. Калі ўсе разам, то гэта ж сіла», — адзначыла яна.

Пра акцыю, якая адбылася 7 снежня, было загадзя паведамлена ў інтэрнэце. Таму некаторыя карыстальнікі папросту даслалі ініцыятарам флэш-мобу свае фота. Іх разам з астатнімі таксама змясцілі на стэндзе. Удзельнікам акцыі стаў і кандыдат у прэзідэнты Мікола Статкевіч, які праходзіў міма. З ім моладзь зрабіла калектыўны здымак.

Мапа Беларусі была шчыльна заклеена фоткамі. А агулам за паўтары гадзіны, як паведамілі арганізатары акцыі, сфатаграфаваліся больш за 100 чалавек. Здымкі будуць змешчаны на сайце www.citizenby.org, а стэнд моладзь пакінула сабе. «Ён застанецца ў нас на офісе як адзін з сімвалаў нашай кампаніі», — паведамілі актывісты.

«Мы хочам, каб чалавек разумеў, што толькі ён можа ствараць Беларусь і можа кантраляваць гэту ўладу, — падкрэсліў Мікіта Красноў, — разумеў, што прэзідэнт, урадаўцы і г.д. — гэта проста чыноўнікі, якіх мы нанялі. Мы нанялі іх, каб яны абаранялі нашы інтарэсы. Калі ў чалавека ёсць праблема, гэта праблема гэтага прэзідэнта і гэтай улады. Не грамадзяне для ўлады, а наадварот, улада створана для грамадзян. І менавіта ад іх залежыць, якой наша дзяржава будзе».

**P.S.** Актывісты кампаніі «Грамадзянін» паведамілі, што будуць дапамагаць людзям у вырашэнні розных праблем — ад ціску адміністрацыі ўніверсітэта на студэнтаў да капітальнага рамонту дамоў. Каардынаты для сувязі: citizenbelarus@gmail.com; тэл. (+375 29) 643 76 40, (+375 29) 551 09 30.

ВЫБАРЫ

# АДКРЫТАЯ ЗАЯВА

Язэп ПАЛУБЯТКА

**На Астравеччыне грамадзяне занепакоены фальсіфікацыяй вынікаў чарговых прэзідэнцкіх выбараў і абгрунтавалі гэта ў адкрытай заяве.**

Дакумент, які падпісалі амаль два дзесятка чалавек, накіраваны ў ЦВК на імя старшыні Лідзіі Ярмошынай, генеральнаму пракурору РБ Рыгору Васілевічу, а таксама кандыдатам у прэзідэнты, АБСЕ, еўрапейскім амбасадарам, кіраўніцтву місіі назіральнікаў СНГ. У заяве выказана занепакоенасць фальсіфікацыяй вынікаў галасавання і яна грунтуецца на тым, як фармаваліся выбарчыя камісіі. У іх склад не патрапіў ні адзін прадстаўнік незалежных грамадскіх арганізацый і палітычных партый, а патрапілі тыя, хто на мінулых выбарах публічна быў злоўлены на фальсіфікацыі. Падпісанты выказваюць жаданне, каб выбары праходзілі адкрыта і сумленна не толькі ў іх раёне, але і ва ўсёй Беларусі, што дасць магчымасць краіне стаць на шлях дэмакратызацыі.

АЛЬТЭРНАТЫВА

# МЫ МАЕМ СЦЭНАР

Алена ВАРАЖБЕЙ

**У дзень Усебеларускага сходу апаненты ўлады правялі альтэрнатыўны сход пад адкрытым небам. Мерапрыемства прайшло ў фармаце сустрэчы кандыдатаў у прэзідэнты з выбаршчыкамі.**



Вечарам 6 снежня Андрэй Саннікаў і Уладзімір Някляеў выступілі ля чыгуначнага вакзала ў Мінску, дзе ўсталяваны круглясутачны пікет Някляева. На сустрэчу з кандыдатамі прыехалі людзі з іншых гарадоў, і атрымалася яна шматлюднай. Розныя сцягі — бел-чырвона-белыя, хрысціянскіх дэмакратаў, кампаніі «Гавары праўду!» і «Еўрапейскай Беларусі», з надпісамі «За Някляева» і гербам Мінска — утварылі пярэстую каляровую палітру. Была зладжана сцэна, і першым са сваёй музычнай праграмай на ёй выступіў рэпер Vinsent.

А Уладзімір Някляеў выступіў з «забароненай прамовай», планаванай для Усебеларускага сходу. Як вядома, кандыдата не прапусцілі ў дэлегаты, хаця за яго вылучэнне на сход падпісаліся 27 тысяч чалавек. Асноўны лейтматыў выступу — зневага народа «хамскай уладай». І заклік «зрабіць свой выбар» і вызначыць сваю будучыню на выбарах 19 снежня.

«Час мяняць лысую гуму!» — крылатай фразай са свайго тэлевыступу распачаў прамову Андрэй Саннікаў. «Беларусь сёння стаіць перад гістарычным выбарам. Мы ўсе можам памяняць сітуацыю. Мы ўсе можам зрабіць так, што Беларусь стане свабоднай», — сказаў кандыдат. Ён заклікаў не галасаваць датэрмінова. «Галасуйце 19-га і прыходзьце разам. Мы сустрэнемся на Плошчы і вырашым лёс краіны», — заявіў Саннікаў.

Паэт Генадзь Бураўкін адрасаваў Усебеларускаму сходу пытанні: «Чаму з усіх кандыдатаў у прэзідэнты на сходзе толькі адзін? Што, іншыя кандыдаты не беларусы? Што, тыя мільёны чалавек, якія за іх падпісаліся, не беларусы? Хіба так можна дазваляць рабіць з намі? Я разумею, што час ад часу людзям трэба збірацца на сходы, збірацца на веча. Але толькі тады, калі збіраюцца ўсе! Калі ж збіраецца толькі купка, гэта не сход. Гэта сходка».

Паэт узгадаў рускага пісьменніка Платонава, які сказаў: «Без мяне народ не поўны». «Дык вось я гэтым, каторыя прыйшлі на сход, кажу: «Без нас, а нас многа, беларускага народа быць не можа. Вы не маеце права выступаць ад імя беларусаў. Мы вам пра гэта нагадваем. І мы павінны яшчэ раз нагадаць пра гэта 19 снежня — дружна, смела, рашуча».

«Кіраўнік, які баіцца свайго народа, не можа быць лідэрам нацыі. А народ, які баіцца свайго кіраўніка, не можа быць гаспадаром сваёй краіны», — заявіў Генадзь Бураўкін.

Журналістка Ірына Халіп нагадала, што яе муж Андрэй Саннікаў у сваім тэлевыступе прапанаваў жанчынам адпусціць сваіх мужчын на Плошчу. «Дык вось, я ўсё ж такі прапаную і жанчынам прыйсці таксама. Я жанчына. Я маці. Я жонка. Я дачка. Я буду на Плошчы. Усе мае блізкія, усе мае сябры будуць на Плошчы».

На Плошчу заклікаў і мастак Аляксей Марачкін. А музычны выступ працягнуў Зміцер Вайцюшкевіч.

Настрой у людзей быў прыўзняты, і ўпершыню адчуўся перадвыбарчы запал. «Жыве Беларусь!» і «Сыходзь!» — скандавалі ўдзельнікі. Праз дарогу на супрацьлеглым баку стаяла група людзей з чырвона-зялёнымі сцягамі. Аднаго з правакатараў — хлопца, які паводзіў сябе агрэсіўна, — затрымалі ля сцэны дружыннікі. Акрамя вялікай колькасці журналістаў, «працавала» шмат апаратараў у цывільным. У іх самая поўная версія мерапрыемства, бо яны здымалі на відэа беспярапынна.

«Плошча будзе мірнай. Калі толькі ўлады не пойдуць на правакацыі. Прыходзьце і не бойцеся. Я са свайго боку абяцаю, што ўсе мае людзі зробяць усё дзеля таго, каб вы былі ў бяспецы», — сказаў прысутным Уладзімір Някляеў. Ён паведаміў, што на Плошчы будзе дружына.

«Мы маем сцэнар Плошчы 19 снежня а восьмай гадзіне вечара. І слухайце толькі тых, хто на гэтую Плошчу вас заклікае. Мы ўсё зможам зрабіць, калі мы будзем разам», — заявіў Някляеў.

Наступная сустрэча з кандыдатамі адбудзецца ў Дзень салідарнасці — вечарам 16 снежня на Плошчы Свабоды.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЦВК ПІКЕТАВАЛІ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Моладзевыя актывісты зладзілі каля Цэнтрвыбаркама пікет з патрабаваннем дадатковага тэлеэфіру для альтэрнатыўных кандыдатаў.**

Каля 40 чалавек стаялі 7 снежня насупраць Цэнтральнай выбарчай камісіі з транспарантамі: «Чаму БТ баіцца праўды?», «Спыніце тэатр аднаго акцёра!», «Патрабуем адну гадзіну прамога эфіру!», «Дзень цішыні даўжынёй у два тыдні?!». Ва ўдзельнікаў акцыі былі сцягі «Гавары праўду!», «За Някляева!» і «Еўрапейскай Беларусі».

Яны прынеслі і вялікую расцяжку з патрабаваннем дадатковых выступаў для кандыдатаў у прэзідэнты. Напярэдадні на ёй пакінулі свае аўтографы кандыдаты Уладзімір Някляеў і Андрэй Саннікаў падчас выступаў ля чыгуначнага вакзала. Моладзь скандавала: «Адну гадзіну праўды!» і «Патрабуем тэлеэфіру!».

Прадстаўнік Някляева ў ЦВК Таццяна Процька тым часам наведала гэту ўстанову. Яна выстаўляла лёс заявы з просьбай аб дадатковым эфіры, перададзенай тыдзень таму. Гэта паўторны зварот у Цэнтрвыбаркам. На першы аналагічны зварот быў адказ, што заканадаўствам не прадугледжана даваць дадатковы эфірны час для кандыдатаў.



Яна адзначыла, што рашэнне аб выдаткаванні эфіру павінна прымаць кіраўніцтва тэлерадыёкампаніі. А ЦВК можа звярнуцца да тэлерадыёкампаніі, каб яна дала гэты час.

«Калі Ярмошына не ідзе да нас, мы ідзем да Ярмошынай», — з такімі словамі моладзь накіравалася да Палаца Рэспублікі, дзе адбываўся Усебеларускі сход. Удзельнікі пікета, якія перарос у шэсце, скандавалі «Патрабуем гадзіну эфіру!» і «Жыве Беларусь!».

Калі большая палова шляху была пройдзена, ля ГУМа ім перагарадзілі дарогу супрацоўнікі міліцыі ў штацкім. Яны «папярэдзілі», што шэсце незаконна. І што маладыя людзі парушаюць закон аб масавых мерапрыемствах. «Таму расказваю, што адназначна вы туды не пойдзеце. Убіраем усю сваю сімволіку і сыходзім», — заявіў адзін з міліцэйскіх начальнікаў, таксама ў цывільнай вопратцы.

«Жыве Беларусь! Да сустрэчы на Плошчы!» — такімі заклікамі скончылася акцыя.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# АНІ СЛОВА ПРА ПАЛІТЫКУ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Шчыра кажучы, я, як у старым савецкім анекдоце, баюся ўключаць прас. Баюся, што ў прасе зноў загучаць кандыдаты ў прэзідэнты. Глядзіце самі, што творыцца ў апошні час.**



У пятніцу — чатыры кандыдаты ў рэдакцыі «Камсамольскай праўды». Субота-нядзеля — тэледэбаты кандыдатаў у прэзідэнты на тэлебачанні і радыё. Панядзелак-аўторак — Усебеларускі народны сход і «тэатр аднаго кандыдата». Серада — зноў чатыры кандыдаты ў рэдакцыі «Камсамольскай праўды» і яшчэ дэбаты на партале tut.by. Таму давайце папросту паглядзім: а чым жыве краіна ў гэтыя дні? Безадносна ад кандыдатаў у прэзідэнты.

Па першае, 8 снежня ў падмаскоўным Нова-Агарове завяршыліся перамовы прэм'ер-міністраў Беларусі і Расіі Сяргея Сідорскага і Уладзіміра Пуціна. Кансультацыі будуць працягвацца на ўзроўні экспертаў, паведаміў журналістам прэс-сакратар кіраўніка расійскага ўрада Дзмітрый Пяскоў па выніках сустрэчы прэм'ераў.

Планавалася, што пасля перамоў Пуцін і Сідорскі выйдуць да прэсы, аднак, як заявіў Пяскоў, ніякіх заяў не будзе. Паводле слоў Пяскова, бакам пакуль не атрымалася дамовіцца па ўсіх спрэчных пытаннях. «Пакольні перамовы будуць працягвацца, адпаведна, не па ўсіх параметрах удалося дамовіцца. Пакуль застаюцца пытанні, якія патрабуюць працягу перамоў», — сказаў Пяскоў.

Як паведамлялася раней, у пачатку сустрэчы Уладзімір Пуцін заявіў, што падчас перамоў разлічвае вырашыць усе астатнія пытанні па фармаванні Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП). «Сустракаемся, як і дамаўляліся, у

> Сяргей Сідорскі зазначыў, што беларускі бок разлічвае да канца гэтага года вырашыць усе пытанні, звязаныя з пастаўкамі вуглевадароднай сыравіны.

сувязі з фактычным заканчэннем сумеснай працы над вялікім пакетам дакументаў, які павінен быць пакладзены ў аснову Адзінай эканамічнай прасторы трох краін — Расіі, Беларусі і Казахстана», — сказаў Пуцін.

«Але, як мы і дамаўляліся, — працягнуў ён, — ёсць пэўныя пытанні, вельмі адчувальныя для эканомікі Расіі і для эканомікі Беларусі, якія мы павінны ўрэгуляваць у двухбаковым фармаце для таго, каб увесь пакет па Адзінай эканамічнай прасторы быў запушчаны ў рэальнае жыццё».

У сваю чаргу Сяргей Сідорскі зазначыў: беларускі бок разлічвае да канца гэтага года вырашыць усе пытанні, звязаныя з пастаўкамі вуглевадароднай сыравіны. «Ёсць шэраг пытанняў, што тычацца паставак вуглевадароднай сыравіны, я хацеў бы, каб мы іх абгаварылі і з пачатку года нашы эканомікі працавалі эфектыўна», — заявіў Сідорскі.

Беларускі прэм'ер паведаміў, што дакументы па фармаванні Адзінай эканамічнай прасторы з боку Беларусі «знаходзяцца ў высокай ступені гатоўнасці». «Але ёсць шэраг пытанняў, якія неабходна абмяркоўваць», — падкрэсліў ён.

Гэта не тое што смешна. Гэта зноў нагадвае анекдот, толькі ўжо пра Ельцына, які часцяком «працаваў з дакументамі» да бясконцасці. Пра нябожчыкаў, канешне, або добрае, або нічога, але зараз Ельцына нагадваюць жывыя людзі, якія ў Беларусі бясконца «працуюць з дакументамі». І, выбачайце, зноў незразумелае пытанне. Адносна фразы Пяскова пра тое, што «кансультацыі будуць працягвацца на ўзроўні экспертаў».

Калі спадарам прэм'ер-міністрам, як Пуціну, так і Сідорскаму, у вырашэнні пытанняў патрэбная дапамога экспертаў, то што яны робяць на сваіх пасадах? Ці не лепш бы было б прэм'ерамі прызначыць тых самых экспертаў? Добра, у Сідорскага эксперт адзін (і мы ведаем, хто ён, але ж дамовіліся не згадваць пра кандыдатаў), а ў Пуціна?

Ну, гэта паміж імі разборкі. Хай самі разбіраюцца, хто ў каго эксперт. Але на гэтым тыдні мы ўпершыню пачулі ўцямнае тлумачэнне таго, навошта была ўведзеная пагалоўная дактыласкапія дарослага мужчынскага насельніцтва Беларусі.

Па словах начальніка дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Аляксея Бягуна, чакаецца, што першыя біяметрычныя дакументы будуць выдадзены ў Беларусі ўжо ў 2012 годзе. Першымі біяметрычнымі дакументамі стануць дакументы для асоб без грамадзянства, якія знаходзяцца ў Беларусі, і людзей, якія атрымалі ў краіне статус бежанца. Затым будзе вырашацца пытанне выдачы нацыянальных біяметрычных пашпартоў.

Гаворачы пра звесткі, якія будуць утрымлівацца ў біяметрычных дакументах, Бягун паведаміў, што абавязкова будуць прысутнічаць адбіткі пальцаў, фатаграфіі і даныя, якія зараз ёсць у нацыянальных пашпартах.

Што ж, мужыкі бадай усе, за выключэннем залішне юрыдычна падкаваных, адбіткі пальцаў здалі. Зараз чакаем, што на гэту ж працэдуру пойдуць і беларускія жанчыны. Маўляў, хацелі роўнасці — атрымайце роўнасць!

Не, усё ж без палітыкі не абыдзецца. З 7 снежня, у адпаведнасці з загадам КТУП «Мінсктранс» Мінгарвыканкама, дзецям, якія атрымліваюць агульную сярэднюю адукацыю, даецца права бясплатнага праезду на ўсіх відах гарадскога пасажырскага транспарту (акрамя таксі). Пра гэта паведамляе прэс-служба Мінгарвыканкама.

Пытанне пра льготны праезд для школьнікаў было ўзнята 6 снежня падчас IV Усебеларускага народнага сходу. Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду на працягу тыдня распрацаваць і прыняць рашэнне наконт надання вучням права льготнага праезду ў гарадскім транспарце.

«Пра гэта гаварылі даверанныя асобы пасля сустрэч з насельніцтвам, з гэтым да мяне звярталіся і парламентарыі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы, выступаючы на Усебеларускім народным сходзе. — Таму даручаю ўраду ў тыднёвы тэрмін прапрацаваць гэта пытанне, пралічыць і ўнесці канкрэтныя прапановы».

Дзіва дзіўнае! Лукашэнка даручыў гэта пытанне ўраду, а рашэнне прынялО КТУП «Мінсктранс» Мінгарвыканкама. І не калі-небудзь, а на наступны дзень пасля заканчэння народнага сходу! Цікава, чаму ж яны так не дбалі пра школьнікаў, калі спярша льготы адмянялі? Чаму не прыслухаліся да астатніх 9 кандыдатаў у прэзідэнты, якія казалі, што адмена ільготаў для школьнікаў і пенсіянераў — папросту непавага да нацыі?

Дарэчы, наконт павагі. Пра якую павагу да ўрада можа ісці размова, калі КТУП «Мінсктранс» Мінгарвыканкама нават не дачакаўся «прапрацоўкі пытання» ва ўрадзе і «ўнясення канкрэтных прапаноў»? Можа, нам сапраўды на месцы міністраў прызначыць мінскіх кіроўцаў аўтобусаў-тралейбусаў? Але яны дакладна з Пуціным не дамовяцца, бо ведаюць, якія ў Маскве пробкі.

Выбачайце, заканчваю на сумнай ноце. Вечарам 7 снежня памерла спявачка і журналістка, «Рок-княгіня–2007» Вольга Самусік. Таленавітая і прыгожая жанчына. Спачуванні родным і блізкім. Беларуская рок-музыка панесла вялізарную страту. Хай яе голас застанецца ў нашым сэрцы.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АЛЕСЬ ПУШКІН



Мастака Алеся Пушкіна абвінавацілі ў злосным хуліганстве — за тое, што ён нібыта пабіў аднавяскоўца, — і асудзілі на 13 сутак арышту, то бок на волю Пушкін выйдзе толькі пасля выбараў. Мастак, вядомы сваёй актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, неаднаразова ўдзельнічаў у палітычных акцыях.

Жонка мастака перакананая, што арышт на 13 сутак — гэта вынік свядомай правакацыі. Яна распавяла, што 8 снежня да іх у двор зайшоў агрэсіўна настроены аднавяскоўец, і мужу давялося яго выводзіць, каб не хуліганіў. Яна гаворыць, што «гэтага чалавека выкарысталі — падаслалі свядома, каб мець падставы затрымаць гаспадара. Міліцыянты з Крупскага РАУС прыйшлі ў хату мастака, заявілі, што на яго ёсць заява за хуліганскі напад, і завезлі затрыманага ў пастарунак».

У час мінулых прэзідэнцкіх выбараў Алеся Пушкіна таксама трымалі пад вартай, асудзіўшы на 15 сутак за дробнае хуліганства. Тады нехта напісаў заяву, што мастак лаецца нецэнзурнымі словамі, прычым заяўнік нібыта пачуў лаянку за паўтара кіламетра, з другога берага рэчкі.

Найбольш скандальны перфоманс Алеся Пушкіна — «Гной для прэзідэнта», за яго правядзенне мастак быў асуджаны да двух гадоў пазбаўлення волі ўмоўна. Алесь Пушкін 21 ліпеня 1999 года на 5-я ўгодкі праўлення Аляксандра Лукашэнкі каля будынка Адміністрацыі прэзідэнта выгрузіў тачку з гноем. Да камплекту ён дадаў партрэт Аляксандра Лукашэнкі, таблічку «за пяцігадовую працу», дэнамінаваную тысячу рублёў, кайданкі, канстытуцыю 1994 года (зменeную на рэферэндуме 1996-га), і афіцыйную дзяржаўную сімволіку.

### СЯРГЕЙ ЛАЗНІЦА



Ураджэнец Баранавічаў, рэжысёр Сяргей Лазніца прадставіў на талінскім рынку кінапрадукцыі Baltic Event свой новы праект «У смузе» — экранізацыю аповесці Васіля Быкава. Дзеянне карціны адбываецца ў акупаванай фашыстамі Беларусі ў 1942 годзе. Па словах Сяргея Лазніцы, ён хоча зняць фільм «пра чалавека ў нечалавечых умовах і пра маральны выбар». Здымкі фільма «У смузе» пройдуць увосень 2011 года, плануецца, што праект стане прадуктам некалькіх краін, у склад міжнароднай здымачнай групы запрошаныя аператар Алег Муту (Румынія), мастак Кірыл Шувалаў (Расія), гукарэжысёр Уладзімір Галаўніцкі (Беларусь/Літва).

Ігравы фільм Сяргея Лазніцы «Шчасце маё», які таксама з'яўляецца супольным праектам некалькіх краін, атрымаў 5 снежня гран-пры XIV Талінскага кінафэсту «Цёмныя ночы». Надаўна стужка перамагла і на кінафэсце «Лістапад» у Мінску.

### УЛАДЗІМІР МАКЕЙ



Прыніжаныя і зняважаныя атрымалі згоду высокага чыну на сустрэчу з імі. Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей прапанаваў прадстаўнікам групы жанчын, якія імкнуліся трапіць у Палац Рэспублікі ў сталіцы, калі там праходзіў Усебеларускі сход, сустрэцца з ім 10 снежня.

Пасля несанкцыянаванага пікету з удзелам больш за 30 прадстаўнікоў групы жанчын з усіх рэгіёнаў краіны, што пацярпелі ад асабліва цяжкіх злачынстваў, не згодныя з рашэннямі судоў па сваіх грамадзянскіх справах і крымінальных справах сваіх блізкіх, пікетоўшчыцы накіраваліся да Палаца Рэспублікі, каб перадаць зварот удзельнікам Усебеларускага сходу. Аднак праваахоўныя органы не дазволілі ім прайсці да Палаца Рэспублікі. Больш за паўгадзіны прадстаўнікі групы жанчын знаходзіліся на Кастрычніцкай плошчы. Затым іх запрасілі ў прыёмны пакой Палаца Рэспублікі, на ўваходзе ў які з імі сустрэўся кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей. Ён запрасіў прадстаўнікоў групы на асабісты прыём 10 снежня і прыняў зварот да Усебеларускага народнага сходу за подпісамі больш чым 60 грамадзян. Яны просяць удзельнікаў сходу падтрымаць іх ініцыятыву аб стварэнні па прыкладзе Вялікабрытаніі незалежнай грамадскай камісіі па пераглядзе крымінальных і грамадзянскіх спраў, а таксама запатрабавалі ад службоўцаў выканання Канстытуцыі Беларусі і законаў краіны.

Цікава, што на пачатку кастрычніка гэтыя жанчыны ў 25-ы раз звярнуліся да прэзідэнта краіны з просьбай аб сустрэчы, каб вырашыць праблему адпісак з органаў суду і пракуратуры. Але зваротнай рэакцыі не было.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ПА КІМ ЗВОНІЦЬ ВЕЧАВЫ ЗВОН?

Сяргей НІКАЛЮК

**За выкананне Канстытуцыі ў нашай краіне можна нарвацца на вялікія непрыемнасці. Уся справа ў тым, што беларуская Канстытуцыя прадугледжвае змену ўлады.**



Скарыстаюся традыцыяй, што ўжо склалася, і пачну з ключавога слова. Гэтым разам — са слова «веча» (ад славянскага «вѣтъ» — рада). Так у славянскіх народаў у старажытнасці называўся калектыўны орган для вырашэння надзённых пытанняў грамадскага, палітычнага і культурнага жыцця. Чаму я пра яго згадаў? Ды таму, што 6–7 снежня ў Мінску прайшоў чацвёрты Усебеларускі народны сход (УНС), які па непаразуменні ў дзяржаўных СМІ паўсюдна называюць «народным веча». Вось толькі адзін прыклад, знойдзены пры дапамозе пошукавіка Google: «Тут жа, у Салігорску, у якасці дэлегата на снежаньскае «народнае веча» зацверджаны і Барыс Батура — кіраўнік Мінаблвыканкама» (сайт тэлеканала СТВ).

А зараз звернемся па тлумачэнне да прафесіянала, да гісторыка Аляксандра Ахіезыра: «Такія інстытуты прамога народакіравання маглі дзейнічаць толькі ў абмежаванай прасторы і пры адносна невялікай колькасці насельніцтва». Г. зн. веча — гэта выключна дадзяржаўны інстытут улады. Найбліжэйшы аналаг веча — сход калгасу.

Але гэта не адзінае пытанне, якое ўзнікае ў мяне з нагоды ўваскрэслай з архаікі формы народаўладдзя. Чаму пасядзелкі прыхільнікаў А. Лукашэнкі называюць усенароднымі? Я нідзе не здолеў адшукаць інфармацыю пра працэнт грамадзян, што прынялі ўдзел у выбарах дэлегатаў. Сайт ЦВК з гэтай нагоды маўчыць. Ён нават не змяшчае адпаведнага раздзелу. Хоць раздзел па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў існуе. Кожны ахвочы без праблем можа даведацца, што 28 верасня 2008 года «ў галасаванні прынялі ўдзел 5 384 647 выбарцаў, ці 76,7 працэнта ад агульнай колькасці ўключаных у спісы». Астатнія, хутчэй за ўсё, у той дзень паленаваліся падняцца з канапаў. Але гэта іх праблемы. Права выбіраць у канстытуцыйныя органы ўлады ў беларусаў ніхто не забіраў.

Іншая справа — УНС. Звернемся па дапамогу да незалежных сацыёлагаў. Дэлегатаў на Веча–2001, паводле апытання НІСЭПД, выбіралі толькі 5,3% беларусаў! Такі вось у нас усебеларускі сход. Тут напрошваецца аналогія з усенародна абраным прэзідэнтам. Так сталі называць Лукашэнку пасля яго перамогі на першых (даярмошынскіх) прэзідэнцкіх выбарах. У другім туры ён набраў 80,1% галасоў, што з улікам яўкі склала 56% ад спіскавага складу выбарцаў.

## Двухаблічныя «мы»

22 лістапада японскі міністр Мінору Янагада падаў у адстаўку. Ён няўдала пажартаваў — заявіў, што быць міністрам вельмі лёгка. Дастаткова памятаць дзве фразы: «Я не каментую асобныя справы» і «Я дзейнічаю ў адпаведнасці з законам». Японцы жарту не ацанілі, справядліва вырашыўшы, што ва ўмовах крызісу такі міністр ім не патрэбны.

18 снежня 2008 года, гледзячы ў тэлекамеры, Лукашэнка зрабіў заяву з нагоды магчымай дэвальвацыі беларускага рубля ў надыходзячым годзе: «*Мы народу обещали. И я сказал председателю Нацбанка: и имей в виду, не дай Бог, мое слово будет нарушено. Придет новый год: 5% — это ничто. Вот возьмите 5% с 2.200. Что, это огромная сумма для наших людей?*»

Прайшло два тыдні і адзін дзень. 2 студзеня рубель абваліўся на 20,5%. Каментара доўга чакаць не давялося: «*Мы честно сказали, почему девальвировали валюту. И вопрос не только в МВФ. Для меня главное — сохранить производства. Пусть даже мы где-то зарплату чуть недополучим, это же год-полтора*». Ключавым словам у апошняй цытаце з'яўляецца займеннік першай асобы множнага ліку «мы» («мы честно сказали» і «мы где-то зарплату чуть недополучим»). Цікава, гэта тыя ж самыя «мы»? Асабіста ў мяне склалася ўражанне, што казалі «*честно*» адны, а «*недополучили*» іншыя.

Але якое дачыненне да «Азбукі паліталогіі» мае японскі міністр? Я прыцягнуў яго для кантрасту. Дэмакратыя прадугледжвае адказнасць палітыкаў перад выбарцамі. У гэтым сэнсе беларусам не пашанцавала. На сем мільёнаў выбарцаў у краіне маецца толькі адзін палітык. Усе астатнія вышэйшыя службовыя асобы па вызначэнні знаходзяцца па-за кантролем насельніцтва. Што да «адзінага палітыка» (АП), то ступень сваёй асабістай адказнасці, як і належыць бацьку ў патрыярхальнай сям'і, ён вызначае сам.

Пра гэты факт неабходна памятаць, калі мы аналізуем рэйтынг АП. У чым яго сэнс? Ва ўмовах дэмакратыі рэйтынгі — гэта вынік прагматычнай ацэнкі выбарцамі практычнай дзейнасці палітыкаў. У нашым выпадку, і тут варта пагадзіцца з дырэктарам «Левада-цэнтра» Львом Гудковым, рэйтынг — гэты выражэнне ілюзій і надзей, сфабрыкаваных дзяржаўнай прапагандай ва ўмовах палітычнай безальтэрнатыўнасці, якая штучна падтрымліваецца.

Вернемся да прыкладу з дэвальвацыяй. Да абяцання народу захаваць стабільнасць рубля рэйтынг АП складаў 40,2%, пасля студзеньскага абвалу — 39,2%. У «адзіных палітыкаў» рэйтынгі, як правіла, тэфлонавыя. Ад вынікаў бягучай дзейнасці яны амаль не залежаць. Такая агульная заканамернасць.




## Не тая працэдура

Час, аднак, вярнуцца ў залу, дзе працуюць дэлегаты. Якія іх паўнамоцтвы? На першы погляд, у УНС можа быць толькі дарадчая функцыя. Беларуская Канстытуцыя, адрэдагаваная АП у 1996 годзе, такога органа ўлады не прадугледжвае. Радзіцца ж каму заўгодна з кім заўгодна Канстытуцыя не забараняе.

Але першы погляд часта бывае памылковым, таму звернемся да архіву. Тэкст даклада АП на першым УНС быў апублікаваны пад загалоўкам «Толькі народ мае права вырашаць свой лёс». Здавалася б, усё зразумела! Беларускі народ, у поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй (артыкул 3), з'яўляецца «адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь». Так ды не так, таму што «*в этом зале — полномочные избранники народа, делегированные всей трудовой Беларусью. Именно ваше мнение будет иметь определяющее значение для меня при принятии важнейших политических решений*» (даклад на першым УНС).

Як казаў герой культавага савецкага фільма: «*Дитям — мороженное. Бабе — цветы*». Народу — права на выказванне меркавання, АП — абавязак прымаць найважнейшыя палітычныя рашэнні. Апора на такі падзел працы дазволіла пазней зрабіць арыгінальны ўнёсак у сучасную паліталогію: «*высшая форма демократии — это разговор напрямую с людьми, представителями наших граждан, каковыми вы являетесь*» (даклад на трэцім УНС).

Але тут я, відавочна, узяў праз край. Размову наўпрост з людзьмі як праяву вышэйшай формы дэмакратыі практыкаваў у свой час яшчэ правадыр сусветнага пралетарыяту. Дастаткова прыгадаць карціну Сярова «Хадакі ў Леніна», без якой цяжка ўявіць сабе інтэр'ер стандартнай савецкай школы. А несмяротная паэма Твардоўскага «Ленін і пячнік»! Ну як тут не працытаваць:

*За столом сидели вместе,*
*Пили чай, велася речь*
*По порядку, честь по чести,*
*Про дела, про ту же печь.*

Яшчэ ў 40-я гады мінулага стагоддзя аўстрыйскі эканаміст і сацыёлаг Ёзэф Шумпетэр адзначаў, што тып дэмакратыі залежыць ад крыніцы ўлады, мэтаў кіравання і працэдуры фармавання вышэйшых дзяржаўных органаў. Усебеларускія «народныя веча» ў гэтым сэнсе цікавыя, у першую чаргу, з пункту гледжання працэдуры.

Калі кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін праявіў настойлівасць у сваім імкненні стаць удзельнікам Веча–2006, то пад крыкі «*Мочить по-черному!*» ён быў збіты людзьмі ў цывільным. За ўсё ў жыцці даводзіцца плаціць, у тым ліку і за наіўную веру ў мандат кандыдата ў прэзідэнты. Ну, паставілі больш за 144 тысячы беларусаў подпісы ў падтрымку прапановы наконт яго вылучэння, ну прызнаў гэтыя подпісы ЦВК. І што? Чытайце Шумпетэра. Дэмакратыя — гэта працэдура! 144 тысячы подпісаў за Казуліна былі сабраныя ў рамках узаконенай працэдуры, а што да «*полномочных избранников народа*», якія раз на пяць гадоў запаўняюць Палац Рэспублікі, то ў законах працэдура вылучэння гэтых «выбраннікаў народа» не згадваецца.

У 2010 годзе гісторыя паўтарылася. Кандыдат у прэзідэнты паэт Уладзімір Някляеў вырашыў загадзя «падсцяліць саломку» і сабраў 27 тысяч подпісаў у сваю падтрымку за вылучэнне дэлегатам на Веча–2010. Не дапамагло. Ён не быў дапушчаны нават на сход упаўнаважаных Ленінскага раёна Мінска.

## Людовік, ты не маеш рацыі!

Каб увайсці ў гісторыю, часам дастаткова прамовіць адну фразу. У 1655 годзе Людовік XIV на пасяджэнні парламента, звяртаючыся да дэпутатаў, быццам бы сказаў: «Вы думаеце, спадары, што дзяржава — гэта вы? Памыляецеся! Дзяржава — гэта я!» Сам факт такога кшталту заявы сведчыць пра тое, што ў Францыі напачатку другой паловы XVII стагоддзя асоба манарха і дзяржава ўжо не ўспрымаліся ў якасці непадзельнай субстанцыі. Таму далёка не выпадкова апошнія гады свайго жыцця Людовік XIV правёў у слязах. Справа ў тым, што рэгентам пры спадчынніку быў прызначаны ненавісны яму Філіп Арлеанскі. Але зрабіць з гэтым хоць штосьці кароль-сонца не мог — усё было па закону.

Беларускі аналаг афарызму Людовіка XIV нарадзіўся ў 2000 годзе падчас селектарнай нарады: «*В Беларуси только один политик! Это Я!*» У розных варыяцыях ён потым шматразова тыражаваўся, і яго канчатковымі адрасатамі заўсёды былі прадстаўнікі выканаўчай улады. Гэты, здавалася б, другасны факт відавочна ілюструе месца прадстаўнічага органа ўлады (парламента) у дзяржаве для народа.

Займацца палітыкай — значыць пераследаваць агульныя інтарэсы. І вось высвятляецца, што ў беларускім парламенце агульны інтарэс ніхто не пераследуе. Гэта найважнейшая функцыя ў нас манапалізавана, і той, хто яе манапалізаваў, у прадстаўнічым органе ўлады не мае патрэбы. З народам ён больш любіць зносіцца наўпрост, без адмысловых працэдурных фармальнасцяў. Як Ленін з пячніком.

Кожная выбарчая кампанія пачынаецца ў нас з афіцыйнай заявы пра тое, што «*выборы пройдут по самым демократичным стандартам. Их легитимность для нас важнее, чем для кого бы то ни было в мире*». Ну якія тут могуць быць пярэчанні? І вось 6 снежня ў 11.00 я ўладкоўваюся ў сваім старэнькім фатэлі, уключаю тэлевізар і... «*Страну Вы (апазіцыя) не получите*».

А зараз уявіце сабе, што амерыканскі прэзідэнт, які ідзе на другі тэрмін, за два тыдні да пачатку галасавання заявіў штосьці падобнае ж кшталту. Я думаю, што ў яго жыцці ў самы найбліжэйшы час адбыліся б вялікія змены, толькі наўрад ці знайшлося б шмат аматараў апынуцца на ягоным месцы.

ВЫБАРЫ

# НЕ ТОЛЬКІ ЛУКАШЭНКА МОЖА КІРАВАЦЬ БЕЛАРУССЮ

**Да выбараў прэзідэнта застаецца фактычна тыдзень, і кандыдаты сканцэнтраваліся на паездках па рэгіёнах. Гэтаму папярэднічаў нядоўгі перыяд агітацыйнай кампаніі, хоць і з лімітаваным, але допускам да дзяржаўных СМІ. Самы час падвесці прамежкавыя вынікі, ацаніць, ці ёсць шанцы на лідэрства і які цяпер расклад сілаў на перадвыбарчым полі. З кандыдатамі ў прэзідэнты размаўляла Вольга Хвоін.**



### Мікола Статкевіч

— Безумоўна, кампанія недэмакратычная, быў пераслед і нават збіццё сябраў ініцыятыўнай групы, хаця ўлада і стрымлівала сябе, бо патрэбныя грошы, крэдыты. Разам з тым ёсць поўнае дамінаванне ў дзяржаўных СМІ аднаго чалавека. Так, запусцілі ўсіх на два тыдні ў эфір у працоўныя дні ў фармаце «галава, што гаворыць». Лепш так, чым нічога. Я паспрабаваў гэтым скарыстацца, каб дапамагчы людзям пераадолець страх, і за гэты час знайшоў аднадумцаў.

Я сапраўды здабыў шмат прыхільнікаў і цяпер баюся не спраўдзіць чаканні гэтых людзей. Кожны дзень, уключна да 18-га снежня, збіраюся ездзіць па Беларусі, сустракацца з людзьмі — Барысаў, Салігорск, Віцебшчына, Гомельшчына, Гродзеншчына, Магілёўшчына. Буду спрабаваць падбадзёрыць людзей, даць ім нейкую надзею, веру ў супольнае змаганне за свабоду. Людзі хочуць бачыць мяне лідэрам, чалавекам, які здолее прывесці краіну да свабоды. У любым выпадку, гэта патрабуе мужнасці, учынкаў.

Аднак толькі простыя людзі змогуць прывесці да дэмакратыі, праз адзіны механізм, які ўлада пакінула — наўпроставы вулічны ціск. Няма выбараў, рэальнага парламенту, больш-менш уплывовых сродкаў масавай інфармацыі. Прагназаваць, ці выйдуць беларусы на вуліцу, не магу, але я там буду, я бяру на сябе адказнасць і не баюся. Кожны чалавек мусіць прыняць для сябе рашэнне, для свайго сумлення, годнасці, якую штодня абражае гэты чалавек з экранаў тэлевізараў. Больш нельга знаходзіцца ў замкнёным коле страху, калі міліцыянт біццца і б'е, людзі баяцца суддзяў, міліцыі, звальненняў. Гэта трэба спыняць.

### Віталь Рымашэўскі

— Безумоўна, у БХД і мяне асабіста павялічылася папулярнасць. Дагрукацца да сэрца беларускага народу больш проста, чым да аналітыкаў, палітолагаў, кулуарнай тусоўкі. Мой рэйтынг падрос. Напрыклад, пасля сустрэчы ў Віцебску са ста чалавек прыкладна кожны трэці пакінуў свае кантакты, каб удзельнічаць у назіранні, дапамагчы БХД у час выбараў. З кожным днём усё больш адчуваецца прысутнасць правакатараў, традыцыйна гэта актывісты БРСМ, яны прызнаюцца, што атрымліваюць разнарадку і прыходзяць на сустрэчы з кандыдатамі, задаюць правакацыйныя пытанні. Але такіх людзей часта абсаджваюць самі прысутныя.

Ёсць праблема з памяшканнямі. У Віцебску было дзесяць адмоў у залах, у Гомелі будзе сустрэча, але нам адмовілі ў памяшканні, дзе ўжо былі сустрэчы з іншымі кандыдатамі. Найбольш не прымальна да Лукашэнкі настроены Мінск, думаю, там у яго падтрымка нулявая, абласныя гарады таксама больш апазіцыйныя.

Цягам апошняга тыдня планую сустрэчы ў Мінску, удзячны журналістам, што яны нарэшце пачалі асвятляць выбарчую кампанію раўнапраўна. Беларускае тэлебачанне дапамагло нам патрапіць у незалежную прэсу, з'явілася цікаўнасць да ўсіх кандыдатаў, а не толькі да тых, якім сімпатызуе рэдакцыя. Ведаю, што многія мяне падтрымаюць, але зразумела, што Лукашэнка намалюе сабе патрэбную лічбу. Гэта рэалістычны прагноз, бо незалежнага кантролю за падлікам галасоў няма.

### Дзмітрый Ус

— У мяне будуць дэбаты ў рэдакцыі інфармацыйнага інтэрнэт-партала tut.by, потым будуць паездкі па рэгіёнах. Мая ацэнка выбарчай кампаніі нічога не значыць, вы мусіце рабіць высновы адносна таго, як усё праходзіць. Практычна ўсе людзі, якія сустракаюцца са мной, пазітыўна ставяцца да наяўнасці альтэрнатыўных кандыдатаў.

Я не канцэнтруюся на тым, каб стаць прэзідэнтам, мая задача значна шырэй — абудзіць грамадскую свядомасць, стварыць умовы для правядзення дэмакратычных выбараў. Гаварыць пра верагоднасць знікнення пад «адзінага» кандыдата цяпер няма сэнсу, вось калі б сістэма была дэмакратычнай... Увогуле, узаемаадносіны з усімі кандыдатамі, апроч Аляксандра Лукашэнкі, які пазбягае кантактаў, у мяне нармальныя.

### Рыгор Кастусёў

— Здаецца, у Беларусі адбылася лібералізацыя, але ўсё адно быў ціск на зборшчыкаў подпісаў, за гэты час двух чалавек з нашай ініцыятыўнай групы звольнілі з працы. Мы адмыслова стараліся не браць студэнтаў, каб яны не мелі праблем. Ёсць новыя павевы ў палітычнай сітуацыі ў Беларусі, але калі скласці разам магчымасці ўсіх альтэрнатыўных кандыдатаў, то мы ў тысячу разоў былі менш у СМІ, чым дзейны прэзідэнт. Што тут аналізаваць, калі ўсё і так бачна. Перад выбарамі два тыдні будзе гаварыць адзін кандыдат, дык навошта яму карыстацца правам выступу, прыходзіць на дэбаты?

Мой рэйтынг за гэты час вырас, людзі пазнаюць, просяць аўтографы. Улады расчухаліся і не ведаюць, як нас спыніць. Мы едзем з Крычава, дзе ўсе нашы аб'явы пра сустрэчы зрывалі, тое ж было ў Касцюковічах. Але і мы вучымся, прымаем меры: зрабілі персанальныя запрашэнні ды раскідалі ў скрынкі. Спачатку такога не здаралася, а цяпер ужо некалькі спробаў сарваць было.

Людзі будуць галасаваць па розуму. Адназначна магу сказаць, што ў Лукашэнкі няма 50 працэнтаў падтрымкі. Мусіць быць другі тур, гэта добра адчуваецца. Там, дзе мы пабывалі, — у гарадках на Магілёўшчыне (не думаю, што іншыя кандыдаты туды даедуць) — людзі ведаюць пра альтэрнатыўных кандыдатаў. Негатыўнае стаўленне да партыі БНФ мы змаглі пераламіць за першыя дні кампаніі. Выступы па тэлебачанню, агітацыйныя друкаваныя матэрыялы змянілі стаўленне да партыі БНФ. Канешне, ёсць і негатыў, але мы разумеем, што свае прыхільнікі ёсць і ў Аляксандра Лукашэнкі, і ў нас.

### Алесь Міхалевіч

— Я лічу гэты этап выбарчай кампаніі дастаткова дэмакратычным. Спадзяюся, што будзе адкрыты, празрысты падлік галасоў. Але многае паказвае на тое, што гэта не адбудзецца. Цяпер я езджу па рэгіёнах, сустракаюся з выбарцамі. Думаю, што ўсіх незалежных кандыдатаў людзі ўспрымаюць пазітыўна. Ёсць пэўная боязь за ўладных структурах — калі я прыходжу ў міліцыю, выканкам. Сярод простых людзей гэтага няма. Пасля галасавання і падліку галасоў я буду вырашаць, ці ісці мне на плошчу.

Калі падлік галасоў будзе празрыстым, то ісці на вуліцу няма сэнсу. У адваротным выпадку я, хутчэй за ўсё, туды пайду, бо гэта мусіць быць акцыя пратэсту, грамадзянскі ўчынак. Ці прынясе гэта акцыя пратэсту нейкі рэальны вынік, мне меркаваць цяжка, бо я не з'яўляюся яе арганізатарам.

### Віктар Цярэшчанка

— Выбарчая кампанія — маленькі крок да дэмакратыі з боку ўлады. Але, каб дасягнуць узроўню хаця б Польшчы, Беларусі спатрэбіцца яшчэ многа гадоў. Добра, што была магчымасць данесці праграму, паказаць людзям альтэрнатыву, паказаць, што ёсць шанец жыць лепш. Мая праграма добрая і мае канкрэтны план дзеянняў. Цяпер будуць дэбаты на tut.by, сустрэчы. Яны, дарэчы, прыносяць добрыя водгукі. Але аўдыторыя малая, прыходзіць нямнога людзей, а часу трэба затраціць нямала.

У мяне і добры, і дрэнны прагноз наконт выбараў. Лукашэнка сказаў, што Беларусь нікому не аддасць, то бок дэмакратычнага фіналу не будзе. Пазітыўна тое, што насельніцтва цяпер мае альтэрнатыўную інфармацыю, ведае пра кандыдатаў, іх прапановы, пра тое, што ў краіне не толькі адзін чалавек разумны і годны да кіравання.

### Андрэй Дзмітрыеў, кіраўнік выбарчага штабу Уладзіміра Някляева

— Можна гаварыць, што адносна 2006 года ёсць паляпшэнне ўмоў правядзення кампаніі — і на стадыі збору подпісаў, і на стадыі агітацыі. Але ўсе зроблена ў дэкаратыўнай манеры. Напрыклад, што тычыцца доступу да СМІ, кожны кандыдат меў гадзіну эфірнага часу, былі тэледэбаты, што праводзіліся супраць усіх правілаў правядзення дэбатаў. Цяпер два тыдні цішыні, калі дзяржаўныя СМІ гавораць збольшага пра кіраўніка Беларусі і ў негатыўным святле — пра альтэрнатыўных кандыдатаў. Мы паспрабавалі размясціць рэкламу Някляева на ўсіх FM-станцыях, на тэлебачанні і паўсюль атрымалі адмову. Тлумачылі гэта тэхнічнымі прычынамі, але ў прыватных размовах гаварылі, што папросту баяцца згубіць магчымасць трансляцыі. То бок усё зроблена, каб немагчыма было сур'ёзна паўплываць на думкі людзей.

З іншага боку, мы бачым, што выступы былі ацэненыя пазітыўна, грамадства іх заўважыла. І нават тыя, хто падтрымлівае Лукашэнку, падзяляюць ідэю, што на тэлебачанні, якое фінансуецца з бюджэту, мусяць быць прадстаўленыя ўсе кандыдаты.

Цяпер план адзін — падрыхтоўка і правядзенне мірнага пратэсту супраць фальсіфікацыяў, ёсць дамоўленасць з нашымі партнёрамі, маем тэхнічны план. Таксама будзем працягваць заклікаць людзей не ісці на датэрміновае галасаванне. Някляеў заклікаў знясца ўсім кандыдатам. Гэта было б моцным крокам, калі б усе пагадзіліся, бо Лукашэнка застаўся б сам-насам, гэта паказала б адзіны пратэст супраць таго, што адбываецца ў краіне. Паглядзім, ці кандыдаты нечага вартыя, але падкрэслю, што Уладзімір Някляеў сказаў, што нават у такім выпадку мусіць быць арганізаваны вулічны пратэст з патрабаваннем правесці выбары ў роўных, нармальных умовах.

▸ ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# БЕЛЛІТ АПАНТАНЫ ЭТНАСАМ І ГІСТОРЫЯЙ

Вольга ХВОІН

**Выданне зборнікаў беларускай прозы з падкрэсленым аўтарствам жанчын, акцэнтам на жаночай тэматыцы справакавала шквал водгукаў: ад пазітыўных да непрыняцця такога падыходу ўвогуле.**



«Самая прасунутая краіна ў свеце ў аспекце гендэрнай праблематыкі — Швецыя. Таму мы скантактаваліся з нашымі сябрамі, Саюзам пісьменнікаў Швецыі», — тлумачыў выбар госці для ўдзелу ў семінары, прысвечаным гендэрнай тэматыцы ў беларускай літаратуры, наменснік Саюза беларускіх пісьменнікаў, галоўны рэдактар часопіса «Дзеяслоў» Барыс Пятровіч.

Госцяй-суддзёй была ўраджэнка Беларусі, а цяпер шведская пісьменніца Інга-Ліна Ліндгвіст. Яна ж ацэньвала пяць твораў пераможцаў літаратурнага конкурсу «Жанчына ў сучасным грамадстве». «Як літаратурны крытык я разглядаю літаратурны твор з трох пазіцый: гендэр, клас, этнас. Як я разумею, у Беларусі ўжо бяскласавае грамадства. У гэтых творах, як ні шукала, я не знайшла ні жанчын, ні сучаснасці. Затое ўбачыла апантанасць этнасам, гісторыяй краіны. Напэўна, гэта натуральна, бо ў Беларусі ёсць гісторыя, але асэнсаванне яе яшчэ не завершанае», — выказалася спадарыня Ліндгвіст адносна прапанаваных ёй да прачытання твораў.

**Інга-Ліна Ліндгвіст пра «жаночую» і «мужчынскую» літаратуру, беларускае і шведскае грамадства, якое і стварае літаратуру на свой вобраз і падабенства:**

— Не трэба літаратуру дзяліць. Іншая справа, што нашмат больш жанчын, чым мужчын, чытаюць мастацкую літаратуру. У Швецыі пакупнікі кніг — жанчыны паміж 20 і 30 гадамі. Кнігі пішуцца для іх. Кожны чалавек хоча бачыць у кнізе адлюстраванне свайго побыту, сваіх праблем, інакш ён страціць цікавасць. Таму жанчына папросту не можа прайсці міма літаратурнага пытання. І не абавязкова кніга для жанчыны мусіць быць нізкапробнай. Класіка — «Ганна Карэніна» Льва Талстога — гэта асэнсаванне сацыяльных праблем жанчыны таго часу, таго грамадства. Цяпер у Расіі ёсць Людміла Уліцкая, якую ніяк не назавеш бульварнай пісьменніцай. Увогуле, падзел літаратуры — гэта не пытанне аўтара, а пытанне зместу, тэмы.

Кніга мусіць быць напісаная пра жанчыну, і яна не павінна выступаць пабочным аб'ектам, дэкарацыяй. Жаночая літаратура Беларусі мусіць знайсці свой голас, свой твар. Я бачу па сябрах, знаёмых, што тут дакладна падзеленыя ролі жанчын і мужчын у грамадстве. У Швецыі мужчыны і жанчыны спрабуюць выйсці за рамкі сваіх роляў. Магчыма, тое не заўсёды атрымліваецца, але гэта актуальна ў сённяшнім грамадстве. Я не выключаю, што падзел роляў мае пад сабой рацыянальнае зерне, але шведы любяць усё новае, любяць эксперыменты. Для жанчыны з Усходняй Еўропы гендэрныя ўзаемаадносіны ў Швецыі часта шакуючыя і нават непрывабныя.

У нас ёсць конкурс «Прыз Аўгуста Стрынберга». Сёлета прыз атрымала пісьменніца, якая напісала дамскі раман. Яна казала, што хоча напісаць жаночы раман, аднавіць гэту традыцыю аповеду пра жанчыну, яе клопаты, перажыванні, і плявать ёй на раўнапраўе. Але найбольш спрэчак выклікаюць аўтабіяграфічныя кнігі. Летась адна пісьменніца напісала ў кнізе пра сваіх мужчын, што і як у яе з імі было, чым гэта скончылася. Усё з сапраўднымі імёнамі. Таямніца прыватнага жыцця перастае такой быць.

Калі гаварыць пра дзіцячую літаратуру, то яна шматаблічная. Цяпер няма новай Астрыд Ліндгрэн. Але пісьменнікаў, што пішуць для дзяцей розных узростаў, многа. Дзіцячыя кнігі выходзяць сотнямі, плюс пераклады. Цяпер у Швецыі цэніцца нарвежская дзіцячая кніга, лічыцца, што нарвежцы падымаюць набалелыя тэмы. Напрыклад, адна з папулярных кніжак «Дзяўчынка, якая трапіла ў сцяну» пра дзяўчынку, якая злілася з інтэр'ерам, была незаўважнай і ўрэшце з сілай разбіла гэту сцяну. Тая ж аўтарка напісала кнігу для дзяцей на табуяваную тэму жыцця і смерці. Гісторыя пра жыццё жанчыны і яе сына-інваліда. Маці ведае, што памрэ, але баіцца, што тады пра яе сына не будзе каму клапаціцца, і яна дае таблетку, каб сын памёр разам з ёй. Такая літаратура мусіць паказваць праўду жыцця, што бываюць розныя сітуацыі. Канешне, гэту кнігу не будуць чытаць усе дзеці, бо большасць усё ж любіць фэнтэзі, прыгодніцкія, дэтэктыўныя гісторыі. Але пра новы трэнд трэба было ўзгадаць.

* * *

Пераможцамі літаратурнага конкурсу «Жанчына ў сучасным грамадстве», які праводзіў Саюз беларускіх пісьменнікаў, сталі празаік, драматург Галіна Багданава, пісьменніцы Данута Бічэль-Загнетава і Людміла Рублеўская. Лаўрэаты конкурсу — Сяргей Егарэйчанка (дэбютаваў у «НЧ» «Аповесцю пра чалавека, які не хацеў быць Богам»), Паліна Качаткова, Раіса Крывацэвіч, паэткі Любава Незабава, Анка Упала, Алеся Лапіцкая паэт-гумарыст Міхась Міранавіч.

▸ ДАБРАБЫТ

# ПРА БУЛЬБУ І ВЫБАРЫ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Аднойчы чытач напісаў мне, што нельга параўноўваць узроўні жыцця ў Беларусі і іншых краінах былога сацыялістычнага лагера.**

На самай справе так: нават у Народнай Польшчы жылося лепей, чым у той жа БССР. Хоць сістэмы былі аднолькавыя, але ж шляхі да светлай будучыні выбіраліся розныя. Прыкладам, у Польшчы калгасы ды дзяржгасы былі створаны на базе гаспадарак, пакінутых уладальнікамі, якія былі вымушаны ўвогуле з'ехаць з краіны. Да сялян нельга было падступіцца і з такімі «дзяржнарыхтоўкамі», якія б дашчэнту вымяталі сялянскія падворкі. Што праўда, дзяржава карысталася магчымасцю ўстанаўліваць манапольна нізкія кошты на сельгаспрадукцыю, але ж яе можна было прадаваць і на вольным рынку.

Тым не менш, у сярэдзіне 1980-х гадоў у Польшчы існаваў амаль такі ж таварны голад, як і ў нас. Пра яго памеры можна меркаваць па такім жыццёвым выпадку. У 1987 годзе мой дзядзька Ян, які паставіў сваёй апошняй у жыцці мэтай знайсці і наведаць магілы сваіх загінуўшых падчас вайны братоў, праз Чырвоны Крыж даведаўся, што адзін з іх, Вацлаў, пахаваны ў вёсцы Кшывулішкі пад Сувалкамі. Дамогся дазволу на выезд, пасля чаго атрымаў магчымасць памяняць нейкую смешную суму рублёў на такую ж смешную колькасць злотых. Цяпер усе гэтыя абмежаванні выглядаюць недарэчнымі і незразумелымі. Усіх дзядзькавых злотых не хапіла б і на адну ноч у гатэлі, а трэба было жыць у Беластоку хоць пару дзён.

Досвед колішняга франтавіка падказаў дзядзьку, што рабіць. Праз знаёмага прапаршчыка ён «дастаў» некалькі бляшанак армейскай тушаніны. Як аказалася, салдацкі «сухі паёк» спраўдзіў сваё прызначэнне. Ужо на аўтобусным вакзале ў Беластоку дзядзька знайшоў прыемную пані, якая дазволіла былому салдату пажыць у сваім дамку цэлыя тры дні. Заадно дапамагла парадамі, куды звярнуцца, як даехаць...

Асабіста мне давялося наведаць Польшчу праз некалькі гадоў пасля «шокавай тэрапіі» Бальцаровіча, пра якую ў нас да гэтага часу кажуць, што яна разарыла палякаў. А мы, маўляў, на гэта не пайшлі і абралі свой шлях — дзякуйце нам. Вось мы і «дзякуем», спажываючы штомесяц па 500 долараў, якія, мусіць, у некага ж ёсць.

Другі чытач піша, што з эканамічнага пункту гледжання не мае сэнсу надаваць столькі ўвагі вытворчасці бульбы і коштам на яе. З той нагоды, што бульба для Беларусі не монакультура, не тое, што, прыкладам, рыс для В'етнама. Насамрэч, бульба не адзіная і нават не асноўная культура для нашай краіны. Але мы звярнулі на яе ўвагу збольшага таму, што яна сёння заняла асобае месца ў палітычнай рыторыцы Лукашэнкі. Быццам бы пад яго мудрым кіраваннем сельская гаспадарка ўжо накарміла народ салам ды кілбасамі, напаіла малаком. А зараз трэба «падцягнуць бульбу» ды канчаткова закрыць сельгаспытанне.

Ці не 4/5 усёй бульбы вырошчваецца ў гаспадарках насельніцтва, да якіх Лукашэнка не мае ніякага непасрэднага дачынення. Гэта пытанне — не яго маштабу, да таго ж яму зусім не цікавае. З прыватных гаспадарак нельга спагнаць падаткі, бо яны адразу ж перастануць садзіць тую бульбу ўвогуле. Гэтыя гаспадаркі не атрымліваюць ад дзяржавы амаль ніякіх грашовых ды іншых рэсурсаў. Іх дзейнасць не паддаецца ні планаванню, ні рэгуляванню, і таму знаходзіцца па-за межамі вялікай палітыкі. Іншая справа, што падчас выбараў ён імкнецца з любой субстанцыі зняць прапагандысцкія плеўкі.

Але бульба, садавіна, гароднія амаль цалкам ці збольшага вырошчваюцца ў гаспадарках насельніцтва і рэалізуюцца па рынкавых коштах, што вызначаюцца дынамікай попыту і прапановы. Калі ж улічыць, што толькі рынкавыя кошты нясуць сапраўдную інфармацыю пра сітуацыю ў эканоміцы, то кошты на названыя вышэй тавары можна разглядаць як своеасаблівыя індыкатары.

Паміж рынкавымі і адміністратыўна ўстаноўленымі коштамі столькі ж знешняга падабенства і такое ж змястоўнае непадабенства, як і паміж дэмакратычнымі выбарамі і іх імітацыяй. На рынку кожны пакупнік мае магчымасць выбраць тавар патрэбнай, на яго думку, якасці і ў колькасці, якая адпавядае колькасці грошай, ахвяраваных на пакупку. І тут за прыклад можна ўзяць кошты на бульбу. У жніўні (на жаль, сёлетніх дадзеных у мяне няма) 2008 года кілаграм бульбы ў сярэднім каштаваў 910 рублёў. Але разбежка цэнаў была вельмі значнай: у Ваўкавыску, Шчучыне, Бабруйску кіло бульбы можна было набыць за 610–720 рублёў, а Глыбокім, Бярэзіне, Клімавічах — па 1050–1380 рублёў. Чаму так, гэта пытанне для эканамістаў-аналітыкаў. Але кожнаму пакупніку такі «прайс» наглядна паказвае: хочаш таннай бульбы, бяры фуру і кіруй на Ваўкавыск.

Калі ж цэны ўстанаўліваюцца зверху, то дзейнічае прынцып — хочаш еш, а хочаш плюй. Але звычайна так адбываецца, што паплююць-паплююць, дый бяруць, што даюць. Гнілую бульбу. Або кандыдата ў прэзідэнты, якога настолькі паўсюль (на тэлебачанні, у газетах, на радыё) многа, што для іншых не застаецца самага маленькага месца. За савецкім часам так было і з бульбай. Паўсюдна яна была таннай, каштавала капейкі, і адной і той жа якасці — 30% давадзілася адразу выкідаць, а яшчэ 30% — як шалупіння пасля чысткі. Нашто ўжо свінні непераборлівыя, але і тыя круцілі лычамі.

Пасля няспыннай барацьбы за мір ва ўсім свеце, пабудовы камунізму, будаўніцтва БАМу ды асваення касмічнай прасторы тэма забеспячэння насельніцтва якаснай бульбай была ці не найгалоўнейшай. Так і засталася нявырашанай.

Што там бульба! Як пачуў некалі ад аднаго варшавяніна, якому да спадобы прыйшліся дэмакратычныя і рынкавыя рэформы, у варшаўскіх крамах зараз можна купіць што заўгодна, нават жывога кракадзіла. А на савецкую тушаніну ніхто нават не гляне. Вырасла пакаленне, якое і не чула пра такую смакату.

Некалькі дзён запар глядзеў украінскае тэлебачанне па розных спадарожнікавых каналах. Галоўная падзея і цэнтральная тэма — акцыя прадпрымальнікаў супраць прыняцця новага падатковага кодэксу, які не адпавядае інтарэсам бізнэсу, а значыць і ўсёй Украіны. Тут было ўсё. І прамыя рэпартажы, і інтэрв'ю, і вычарпальная інфармацыя пра сутнасць патрабаванняў, пра рэакцыю ўладных структур.

Ніякіх «вашывых блох». Поўная павага і дэманстрацыя жадання да канструктыўнага вырашэння канфлікту. Кульмінацыйны момант — прыезд на Майдан Януковіча з весткай пра тое, што ён наклаў «вета» на праект кодэксу з празмерным фіскальным ухілам.

Цяжка патлумачыць маладым, чаму мы ўсё былі ўладзе куплялі тую танную гнілую бульбу. Цяжка патлумачыць тым жа ўкраінцам, якія не здольны зразумець, чаму мы так жа чынам выбіраем сабе прэзідэнта.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 13 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.15** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10, 18.50, 01.05** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.30** «У свеце матораў».
**09.10** «У цэнтры ўвагі».
**10.35** Культурныя людзі.
**11.05** Меладраматычны серыял «Маруся».
**12.15** Камедыйная меладрама «Елка, трус, папугай» (Украіна).
**14.05** Ток-шоў «Мая цудоўная няня».
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Nota Bene.
**16.30** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.10** Меладраматычны серыял «Маруся».
**18.20** Праграма «Акно ў Еўропу».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-5» (ЗША).
**23.30** Камедыйны трылер «Рызыкуючы жыццём» (ЗША).
**01.10** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15** Навіны спорту.
**11.10** «Выклік». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Дзікі маладняк».
**16.50** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Выбар +. Адмысловы выпуск».
**23.20** АНТ прадстаўляе: «Уладзімір Співакоў запрашае…».
**00.45** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «У тэму».
**20.30** Фільм «Ніколі не забуду цябе!». Расія.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Паварот». ЗША-Францыя.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.00** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**10.10** Меладрама «Разумнікі» (ЗША).
**11.55** Пра мастацтва.
**12.25** Школа рамонту.
**13.25** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка). Заключная серыя.
**14.20** «Расшыфравацць дрэс-код». Дакументальна- пазнавальны цыкл (Францыя).
**14.50** Мультсерыял «Драконьчык і яго сябры» (Канада).
**15.15** Пазакласная гадзіна.
**15.30** Тэлебарометр.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.45** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**17.50** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**18.55** Хакей. Чэмпіянат свету U-20. Украіна-Беларусь. Прамая трансляцыя.
**21.20** Калыханка.
**21.35** Тэлебарометр.
**21.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Манчэстэр Юнайтэд-Арсенал. Прамая трансляцыя.
**23.55** Авертайм.
**00.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**01.20** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Гарадок».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.35** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.30** Тэлесерыял «Вы заказвалі забойства».
**22.20** Тэлесерыял «Целаахоўнік».
**23.20** «Нічога асабістага».
**23.45** «Весткі.ru».
**00.05** «Прыгажосць па-савецку. Лёс манекеншчыцы». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.40** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.35** Баявік «Кодэкс гонару».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.40** Серыял «Брат за брата».
**00.05** «Сумленны панядзелак».
**01.00** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**09.35** Лёгкая атлетыка. Бег па перасечанай мясцовасці. Чэмпіянат Еўропы. Албуфейра (Партугалія).
**10.30, 14.15, 02.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам. Валь д'Ізэр (Францыя). Спроба 2.
**11.00, 14.45** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хахфільцэн (Аўстрыя).
**12.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка праследу. Хахфільцэн (Аўстрыя).
**12.30, 16.00, 21.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).
**13.30, 01.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам-гігант. Сэнт-Морыц (Швейцарыя). Спроба 2.
**17.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**19.00** Футбол. Госць тыдня. Часопіс.
**19.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**02.25** «Спартовае вандраванне. Конны спорт». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Выбары-2010.
**07.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Род Астрожскіх».
**08.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**08.15** ПраСвет.
**08.40** Эксперт.
**09.00** Прыватная калекцыя.
**09.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.40** Басанож па свеце: «Касміты».
**10.10** Дакументальная гадзіна: «Камунізм: гісторыя адной ілюзіі», дак. фільм, Германія: 1 серыя, «Ленінская рэвалюцыя».
**11.00** Два на аднаго: Азбука маладых.
**11.35** «Час гонару», серыял: 7 серыя.
**12.20** Фільматэка майстроў: «Ангельскі тракт», маст. фільм, 2006 г., Вялікабрытанія–Іспанія–ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Выбары-2010.
**17.25** «Мой родны горад», серыял.
**17.50** «Час гонару», серыял: 7 серыя.
**18.15** Два на аднаго: Азбука маладых.
**19.05** «Госць «Белсату».
**19.35** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Забойства напярэдадні вясны», Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.30** Выбары-2010.
**21.45** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**22.05** Два на аднаго: Азбука маладых.
**22.45** Фільматэка майстроў: «Ангельскі тракт», маст. фільм, 2006 г., Вялікабрытанія–Іспанія–ЗША.
**00.40** Аб'ектыў.

## 14 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.10, 18.00, 19.00, 23.15** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.30** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.15** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Меладрама «Варанька» (Расія).
**14.05** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.45** Патрабуецца.
**16.05** Відэафільм АТН цыклу «Зямля беларуская».
**16.15** Відэафільм АТН «Дзіцячае Еўрабачанне - 2010. за кадрам».
**16.40** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**17.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-5» (ЗША).
**23.30** Прэм'ера. Камедыя «Аднойчы ў Версалі» (Францыя).
**01.35** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Выклік». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Выбар +. Адмысловы выпуск».
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** АНТ прадстаўляе: «Уладзімір Співакоў запрашае…».
**00.45** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Ніколі не забуду цябе!». Расія.
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Меч». Серыял. Заключная серыя.
**21.25** «Пяць хвілін».
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**23.50** «Спецкар аддзела расследаванняў». Серыял.
**00.50** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.00** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**10.10** «Усе нябачныя дзеці». Драма (Італія-Францыя).
**12.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**13.20** Авертайм.
**13.45** «Запал па культуры».
**14.30** Сямейная меладрама «Бомж» (Украіна). 1-я серыя.
**15.30** Пазакласная гадзіна.
**15.45** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.40** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**17.50** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**18.55** Хакей. Чэмпіянат свету U-20. Беларусь-Японія. Прамая Трансляцыя. У перапынку: Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.25** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.45** «Спорт-кадр».
**00.15** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Аркадзь Гайдар. Апошняя таямніца». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** «Кулагін і партнёры».
**12.15** Тэлесерыял «Вы заказвалі забойства».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Вы заказвалі забойства».
**22.20** Тэлесерыял «Целаахоўнік». «Як выглядае рай».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Прамяні смерці. Гіпербалоід інжынера Філіпава». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.40** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Жаночы погляд».
**12.10** «Да суду».
**13.35** Баявік «Кодэкс гонару».
**15.10** «Справа густу».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.40** Серыял «Брат за брата».
**00.05** Серыял «Вінтавая лесвіца».

### EUROSPORT

**09.30** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**10.00, 14.45, 19.00, 01.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).
**11.00, 17.15, 20.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**11.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**12.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**16.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хахфільцэн (Аўстрыя).
**16.45** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка праследу. Хахфільцэн (Аўстрыя).
**17.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**19.45, 02.15** Ралі. Мэта - Дакар. Часопіс.
**20.00** «Алімпійскія гульні. Лондан». Часопіс.
**20.05** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**22.00** Бокс.
**00.00** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit.
**00.15** Ралі. Ралійная серыя IRC. Агляд сезону.
**02.25** «Спартовае вандраванне. Гольф». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Выбары-2010.
**07.35** Еўропа сёння.
**08.10** Два на аднаго: Азбука маладых.
**08.30** «Час гонару», серыял: 7 серыя.
**09.15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Забойства напярэдадні вясны», 2010 г., Польшча.
**09.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**10.05** Госць «Белсату».
**10.20** «Мой родны горад», серыял.
**10.40** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**11.00** Два на аднаго: Азбука маладых.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Выбары-2010.
**17.20** «Мой родны горад», серыял.
**17.45** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 15 серыя.
**18.40** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.10** ПраСвет.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Праект «Будучыня».
**20.10** Два на аднаго: Азбука маладых.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.30** Выбары-2010.
**21.45** Сальда (эканамічная праграма).
**22.00** Два на аднаго: Азбука маладых (публіцыстычная праграма).
**22.35** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**23.00** «Доктар Марцін», серыял.
**23.45** Аб'ектыў.

## 17 СНЕЖНЯ, ПЯТНІЦА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 00.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Прэм'ера. Камедыйная меладрама «Трамвай у Парыж» («Беларусьфільм»).
**14.05** «Школа доктара Камароўскага» (Украіна). Ток-шоў.
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Патрабуецца».
**16.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Камедыя «Неваляшка» (Расія).
**00.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**01.05** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**01.50** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Выклік». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Зімовая серыя гульняў.
**22.45** Наша «Белараша».
**23.20** Цырымонія ўручэння народнай прэміі «Залаты грамафон».
**02.30** Начныя навіны.

### СТБ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Правілы згону». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.30** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Блізнюк». Францыя, 1984 г.
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відэзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «Электра». ЗША-Канада.
**01.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Час футболу.
**08.30, 16.15** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**10.40** Дак. фільм «Час патрыётаў».
**11.15** Гаспадар.
**11.40** Кінаспробы.
**12.00** Жывы гук.
**12.40** Меладрама «Дунечка».
**14.35** «Расшыфраваць дрэс-код». Дакументальна- пазнавальны цыкл (Францыя).
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.20** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**17.20** Усё аб бяспецы.
**17.50** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**18.55** Хакей. Чэмпіянат свету U-20. Беларусь-Вялікабрытанія. Прамая трансляцыя. У перапынку: Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.10** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.20** «Пра мастацтва».
**23.45** Дыялогі аб рыбалцы.
**00.15** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**01.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Вы заказвалі забойства».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Прэм'ера. «Юрмала-2010». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.25** «Дзяўчаты».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** Фільм «Адзіная».

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Мама ў вялікім горадзе».
**09.00** «У зоне адмысловай рызыкі».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.10** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**12.05** «Да суду».
**13.35** Баявік «Кодэкс гонару».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Гісторыя ўсерасійскага змагання».
**23.00** Спецвыпуск. «Апошняя слова».
**00.10** Трылер «Той, што не пакідае след».

### EUROSPORT

**09.30** Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе. Дубай (ААЭ). Дзень 3.
**11.30** Плаванне. Часопіс.
**11.45** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы (Славенія).
**13.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Лёсаванне.
**14.00** Ліга Еўропы. Лёсаванне.
**14.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).
**15.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Кваліфікацыя (Швейцарыя).
**16.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Супер-гігант. Валь Гардэна (Італія).
**17.00** Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе. Дубай (ААЭ). Дзень 3.
**19.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.55, 23.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Кваліфікацыя (Швейцарыя).
**21.00** Бокс. Турнір Bigger's Better. Кіпр.
**00.30** Санкавы спорт. Кубак свету. Жанчыны. Парк Сіці (ЗША). Спроба 1.
**01.30** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit.
**01.45** Санкавы спорт. Кубак свету. Жанчыны. Парк Сіці (ЗША). Спроба 2.
**02.25** «Спартовае вандраванне». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Выбары-2010.
**07.45** Праект «Будучыня».
**08.10** Два на аднаго: Азбука маладых.
**08.45** Рэпартэр.
**09.10** Форум (ток-шоў).
**09.50** Два на аднаго: Азбука маладых.
**10.30** «Школа на санцапёку», серыял.
**10.55** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 11 серыя.
**11.40** Два на аднаго: Азбука маладых.
**12.15** «Забароненыя стужкі», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**12.45** «Палкоўнік Квяткоўскі»», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**14.50** Два на аднаго: Азбука маладых (публіцыстычная праграма).
**15.25** «Звычайны прэзідэнт», дак. фільм, 1997 г., Беларусь.
**16.20** Два на аднаго: Азбука маладых.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**17.35** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 11 серыя.
**18.25** «Бульбаны», мультсерыял:.
**18.30** Форум (ток-шоу).
**19.15** Маю права (прававаядя праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** На колах.
**20.15** Два на аднаго: Азбука маладых.
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма): «Род Астрожскіх».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.30** Госць «Белсату».
**21.45** «Бульбаны», мультсерыял.
**21.50** Два на аднаго: Азбука маладых.
**22.30** «Здарэнні з хронікі кахання», маст. фільм, 1985 г., Польшча.
**00.25** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Рыхтаванне».
**00.35** Аб'ектыў.

## 18 СНЕЖНЯ, СУБОТА

### 1

**07.00** Мультфільмы.
**07.15** Існасць.
**07.40** Дзень спорту.
**07.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.15** «OFF STAGE LIFE».
**10.30** Дак. цыкл «Невядомая версія».
**11.25** Камедыя «Службовы раман». (СССР). 1-я, 2-я серыі.
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.15** «Праверка чутак».
**16.45** Nota Bene.
**17.10** Відэафільм АТН «Дзіцячае Еўрабачанне - 2010. за кадрам».
**17.40** Відэафільм АТН цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Канцэртная праграма «Разам са сваёй краінай».
**21.00** Панарама.
**21.50** Фільм тыдня. Прэм'ера. Рамантычная камедыя «Нянька па выкліку» (ЗША).
**23.40** Меладрама «Чырвоны жэмчуг кахання» (Расія-Украіна).
**01.05** Дзень спорту.

### ОНТ

**07.00, 08.00, 09.00** Нашы навіны.
**07.05** «Суботняя раніца».
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**10.15** «Здароўе».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.55** Прэм'ера. «Мікалай Рыбнікаў. Хлопец з Зарэчнай вуліцы «.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Разумніцы і разумнікі».
**14.00** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Здабытак Рэспублікі».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Здабытак Рэспублікі». Працяг.
**19.30** «Адзін супраць усіх».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.15** «Пражэктарпэрысхілтан».
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** «Што? Дзе? Калі?».
**00.30** Прэм'ера. «Уладзімір Варашылаў. Усё жыццё - гульня».
**01.30** Начныя навіны.

### СТБ

**06.25** Фільм. СССР, 1959 г.
**07.40** Фільм «Блізнюк». Францыя, 1984 г.
**09.35** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.20** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.55** Фільм «Кар'ера Дзімы Горына». СССР.
**15.45** «Відэзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Фільм «Там, дзе жыве каханне». Украіна, 2006 г.
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Аднойчы ў Вегасе». ЗША.
**23.20** Фільм «Аўгуст Раш». ЗША, 2007 г.
**01.20** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**08.00** Усё аб бяспецы.
**08.25** «Лабірынты гісторыі беларускага фотамастацтва». 1-я частка.
**08.55** «Рэальны свет».
**09.30** Дыялогі аб рыбалцы.
**10.00** Жансавет.
**10.40** Дача здароўя.
**11.20** «Запал па культуры».
**12.05** Тэлебарометр.
**12.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**13.30** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**14.55** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.15** Народная камедыя «Каханне і галубы» (СССР).
**18.20** «Навагодні жарт з…» Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.20** Тэлебарометр.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Ліверпуль-Фулхэм. Прамая трансляцыя.
**21.25** Вестэрн «Вадаспад Анёла» (ЗША).
**23.35** Жывы гук.
**00.20** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Паўфінал.

### РОССИЯ

**07.00** Мультфільмы.
**07.15** Фільм «Лімузін колеру белай ночы».
**08.40** «Юрмала-2010». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Адзіная».
**13.45** «Пакой смеху».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Нататкі натураліста».
**14.50** «Шукальнікі». Дак. фільм.
**15.50** Прэм'ера. «Трагедыя Галіцкай Русі». Дакументальны фільм.
**16.50** Фільм «Выйсці замуж за капітана».
**18.25** «Сумленны дэтэктыў».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Тэлесерыял «Сваты-3».
**00.35** «Новая хваля - 2010». Лепшае.

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.50** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.15** Прыгодніцкі фільм «Грамабой».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Апошняе слова». Вострасюжэтнае ток-шоў.
**17.30** «Вочная стаўка».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія Рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум. Расследаванні, якія дакранаюцца кожнага».
**21.15** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.20** «Ты не паверыш!».
**23.20** «Музычны рынг НТБ».
**00.50** «Мужчынскія гульні Кацярыны Фурцавай».

### EUROSPORT

**09.30** Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе. Дубай (ААЭ). Дзень 4.
**10.50** «Алімпійскія гульні. Лондан». Часопіс.
**11.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Кваліфікацыя (Швейцарыя).
**12.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Спрынт. Паклюка (Славенія).
**13.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Хуткасны спуск. Валь Гардэна (Італія).
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**16.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 30 км. Вольны стыль (Францыя).
**17.25** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**17.30** Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе. Дубай (ААЭ). Дзень 4.
**19.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Паклюка (Славенія).
**20.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 15 км. Вольны стыль (Францыя).
**20.45** Вось дык так!!!
**21.45** Санкавы спорт. Кубак свету. Двойкі. Парк Сіці (ЗША). Спроба 2.
**22.30** Конны спорт. Алімпія. Міжнароднае коннае шоў. Канкур (Вялікабрытанія).
**23.00** Конны спорт. Алімпія. Міжнароднае коннае шоў. The Santa Stakes. Канкур. Лондан (Вялікабрытанія).
**00.30** Санкавы спорт. Кубак свету. Мужчыны. Парк Сіці (ЗША). Спроба 1.
**01.30** Санкавы спорт. Кубак свету. Жанчыны. Парк Сіці (ЗША). Спроба 2.
**02.00** Санкавы спорт. Кубак свету. Мужчыны. Парк Сіці (ЗША). Спроба 2.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.50** «Бульбаны», мультсерыял: «Бульбаны ідуць на выбары».
**07.55** Госць «Белсату».
**08.10** Калыханка для самых маленькіх.
**08.45** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**09.15** Форум (ток-шоу).
**10.00** «Бульбаны», мультсерыял: «Бульбаны ідуць на выбары».
**10.05** Маю права (прававаядя праграма).
**10.25** «Здарэнні з хронікі кахання», маст. фільм, 1985 г., Польшча.
**12.10** Без рэтушы: «Бывай, зброя?..», 2010 г., Беларусь.
**12.35** «Машына зменаў», серыял.
**13.35** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**14.05** Макрафон: «Салідарныя з Беларусcю–2009».
**15.30** «Код прысутнасці», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**16.10** «Ранча», серыял: 13 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял: 15 серыя.
**18.00** «Рэвалюцыянеры», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**18.55** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.30** «Бульбаны», мультсерыял: «Бульбаны ідуць на выбары».
**20.35** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Матадор», маст. фільм, 2005 г., ЗША–Ірландыя–Германія.
**22.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Дзяды Марозы»: ч. 1.
**23.00** Аб'ектыў.

## 19 СНЕЖНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**1**

**07.10** Дзень спорту.
**07.20** Музычная камедыя «Сем старых і адна дзяўчына» (СССР).
**08.00, 10.00, 11.00, 13.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00, 23.30** Навіны. Адмысловы выпуск.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.25** «Арсенал».
**10.15** «Беларусь адкрытая свету». Канцэртная праграма.
**12.25** Народная камедыя «Белыя Росы».
**15.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Беларусь адкрытая свету». Канцэртная праграма.
**17.05** Суперлато.
**18.30** «Славянскі базар». Абранае.
**19.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.50** «КЕНО».
**21.00** Інфармацыйны канал.

**АНТ**

**07.00, 08.00, 09.00** Нашы навіны.
**07.10** «Нядзельная раніца».
**09.10** Нядзельная пропаведзь.
**09.25** Серыял «Мая выдатная няня».
**10.00** Нашы навіны.
**10.15** «Залатая калекцыя «Пясняроў».
**11.00** Нашы навіны.
**11.15** «Залатая калекцыя «Пясняроў». Працяг.
**12.00** Нашы навіны.
**12.15** «Залатая калекцыя «Пясняроў». Працяг.
**13.00** Нашы навіны.
**13.15** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.45** «Давай ажэнімся!».
**14.00** Нашы навіны.
**14.15** «Давай ажэнімся!». Працяг.
**15.00** Нашы навіны.
**15.15** «Брэйн-рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** «Брэйн-рынг». Працяг.
**16.30** «Бітва тытанаў».
**17.00** Нашы навіны.
**17.15** «Бітва тытанаў». Працяг.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** «Музычны суд». Фінал.
**19.00** Нашы навіны.
**19.15** «Музычны суд». Фінал. Працяг.
**20.00** Контуры.
**21.05** Выбары-2010. Прамы эфір.
**23.25** Прэм'ера сезону «Лёд і полымя».
**02.25** Фільм «Ідальга».
**05.20** «Дэтэктывы».

**СТВ**

**06.20** Фільм. СССР, 1977 г.
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** Фільм «На спіне ў чорнага ката». Беларусь, 2008 г.
**09.00** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Вялікі сняданак».
**11.20** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.00** «Добры дзень, доктар!».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** Фільм «Пакроўскія вароты». СССР.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Ля параднага пад'езду».
**17.25** Фільм «Чаклун і Румба». Беларусь, 2007 г.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**21.10** СТБ прадстаўляе: юбілейны канцэрт ансамбля «Сябры».
**00.05** Фільм «Пяшчотная зіма». Беларусь-Расія, 2005 г.

**ЛАД**

**07.20** Дабравест.
**07.45** Мір вашай хаце.
**08.00, 09.00, 12.00, 15.00** Навіны. Адмысловы выпуск.
**08.10** Кінаспробы.
**08.25** Медычныя таямніцы.
**09.15** Дак/ фільм «Час патрыётаў».
**09.50** Школа рамонту.
**10.55** Бухта капітанаў.
**12.20** Канцэртная праграма.
**13.10** Біятлон. Кубак свету. Змяшаная эстафета. Прамая трансляцыя.
**14.40** «Правы чалавека».
**15.20** Гаспадар.
**15.50** Музычны спектакль «Красуні».
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Чэлсі-Манчэстэр Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**19.55** Хакей. Чэмпіянат свету U-20. Латвія - Беларусь.
**22.00** Тэлебарометр.
**22.20** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Фінал.
**23.50** Celine Dion «Taking Chances World Tour». Канцэрт (ЗША).

**РОССИЯ**

**07.00** «Уся Расія».
**07.25** Тэлесерыял «Сваты-3».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Канцэрт «Пецярбург-Ленінград».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст.
**15.15** «Рамантыка раманса». Дак. фільм.
**16.05** «Армэн Джыгарханян. Добры дзень, гэта я». Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Фільм «Праверка на дарогах».
**18.50** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера-2010. «Стылягі-шоў». Гала-канцэрт.
**23.00** Навіны - Беларусь.
**23.10** Прэм'ера-2010. «Стылягі-шоў». Гала-канцэрт. Працяг.
**23.50** 1/2 фіналу першай лігі «КВЗ».

**НТВ**

**07.30** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Праспявана ў СССР».
**14.20** «Суд прысяжных: Галоўная справа».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Развод па-руску».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.55** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.10** Прэм'ера. Фільм з цыклу «Пятніцкі».
**00.15** «Асабліва небяспечны!».
**00.50** «Нерэальная палітыка».

**EUROSPORT**

**09.30** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**09.35** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit.
**09.45** Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**10.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам-гігант. Спроба 1.
**11.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Валь д'Ізэр (Францыя).
**12.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 4 х 5 км. Ла Клюсаз (Францыя).
**13.30** Біятлон. Кубак свету. Змяшаная эстафета. Паклюка (Славенія).
**14.45** Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**16.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 4 х 10 км. Ла Клюсаз (Францыя).
**17.10** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**17.15** Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе. Дубай (ААЭ). Дзень 5.
**19.45** Біятлон. Кубак свету. Змяшаная эстафета. Паклюка (Славенія).
**21.00** Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**22.00** Конны спорт. Алімпія. Міжнароднае коннае шоў. Канкур (Вялікабрытанія).
**23.00** Конны спорт. Алімпія. Міжнароднае коннае шоў. The Ivy Stakes. Канкур. Лондан (Вялікабрытанія).
**00.30** Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**01.30** Біятлон. Кубак свету. Змяшаная эстафета. Паклюка (Славенія).

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** Тыдзень з радыё «Свабода».
**08.10** Калыханка для самых маленькіх.
**08.40** Навігатар.
**09.05** Вагон.
**09.10** «Рэвалюцыянеры», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**10.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.15** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Ежа з джунгляў».
**10.40** «Арол: крымінальная сага», серыял: 15 серыя.
**11.35** «Матадор», маст. фільм, 2005 г., ЗША–Ірландыя–Германія.
**13.05** «Журналісты», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**14.00** «Чароўнае дрэва», серыял: 3 серыя.
**14.25** Сальда (эканамічная праграма).
**14.40** «Плошча», дак. фільм, 2006 г., Беларусь.
**16.05** «Ранча», серыял: 14 серыя.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Час гонару», серыял: 8 серыя.
**18.10** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**18.35** Дакументальная гадзіна: «Камунізм – гісторыя адной ілюзіі», дак. фільм, 2005 г., Германія: 2 серыя, «Сталінская імперыя зла».
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Гаштольды».
**19.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.00** Вечар выбараў. Жывая трансляцыя.
**22.00** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.20** Фільматэка майстроў: «Ляціце на Расінанце», маст. фільм, 2007 г., Балгарыя.
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Дзяды Марозы»: ч. 2.

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль газету «Новы час» не магчыма купіць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: 8029 6043457, Юрый
Віцебск: 8029 3084978, Юрый
Масты : 8029 1387994, Дзмітрый
Мінск: 8029 9687973, Аляксей, 8 029 1783168, Вольга, 8029 6255751, Аксана

**Шаноўныя чытачы!**

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

Але для тых, хто падпішацца на «Новы час» да 1 студзеня, кошт застанецца ранейшы (500 руб нумар, 2000 — месяц).

**«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.**

**Даведка па тэл: 8029 6255751**

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ______
Всего ______

Кассир

КНІГА

# ЧОРНАЯ ІМША

Алег НОВІКАЎ

**У пагоні за захапляльнай інтрыгай вядомы італьянскі літаратар Умберта Эка напісаў раман, які не спадабаўся Ватыкану і яўрэйскай грамадскасці.**



Прадстаўляць Умберта Эка і яго творчасць наўрад ці трэба. Дастаткова згадаць такія славутыя раманы, як «Імя ружы» або «Маятнік Фуко». Амаль усе кніжкі Эка сталі сусветнымі бестселерамі. Бестселерам дакладна стане і шостая кніжка пісьменніка — «Пражскія могілкі». Пра гэта сведчыць статыстыка: кніга з'явілася ў Італіі ў пачатку лістапада і хутка стала рэкардсменам продажу. Толькі за месяц было рэалізавана больш за 200 тысяч экземпляраў. Зараз рыхтуецца другі наклад.

Дадатковым фактарам цікавасці да «Пражскіх могілак» відавочна будзе скандал, які з кожным днём разгараецца вакол кнігі. Каталіцкая і яўрэйская грамадскасць лічыць, што Эка свядома або несвядома адрадзіў інтарэс да антысеміцкіх міфаў.

У аснове фабулы раману, падзеі якога, дарэчы, адбываюцца напрыканцы XIX стагоддзя, прыгоды капітана Сіманіні. Сіманіні, па словах самога Эка, «самы цынічны і пазбаўлены прынцыпаў чалавек, якога ведала гісторыя». У капітана незвычайная прафесія — выраблене фальшывых гістарычных дакументаў для розных каралеўскіх двароў. Падчас падарожжаў па Еўропе герой становіцца сведкам такіх вядомых падзей, як Парыжская камуна, аб'яднанне Італіі і г.д. Неяк Сіманіні прапануюць напісаць «Пратаколы сіёнскіх мудрацоў» пра тое, што яўрэі быццам жадаюць падпарадкаваць сабе свет. Галоўны герой ахвотна бярэцца за справу. Для гэтага яму перш за ўсё давядзецца сабраць усе брудныя плёткі пра яўрэяў і іх саюзніках — лібералаў.

«Пратаколы сіёнскіх мудрацоў», як вядома, існавалі ў рэальнасці. Гэта антысеміцкая фальшыўка, якую рэакцыянеры выкарыстоўвалі супраць рэвалюцыйнага і дэмакратычнага руху. У тэкстах выкладаюцца планы яўрэяў: устанаўленне сусветнага панавання, інфільтрацыі ў структуры кіравання дзяржавамі, знішчэнне іншых рэлігій. Пазней фрагменты «Пратаколаў» сталі часткай нацысцкай прапаганды. На самай справе, як стала вядома ў 1920 годзе, «Пратаколы» — гэта плагіят малавядомага французскага памфлета сярэдзіны XIX стагоддзя, накіраванага супраць Напалеона III.




У прынцыпе, да выхаду кнігі ніхто асаблівай увагі на тэму «Пратаколаў» не звяртаў. Тым больш, што сам Эка казаў, што фішка твору ў іншым. У тым, каб зрабіць рэмэйк жанру газетнага раману з працягам, папулярнага ў XIX стагоддзі. Такія раманы, якія пісалі часам вядомыя аўтары кшталту Аляксандра Дзюма, друкавалі шматлікія газеты. Маркетынгавы прыём будаваўся на тым, каб кожны раздзел заканчваўся на нейкім цікавым месцы, штурхаючы чытача набываць наступны выпуск. Фірменным знакам такіх раманаў з працягам былі таксама гравюрныя ілюстрацыі, якія, дарэчы, прысутнічаюць і ў кнізе «Пражскія могілкі».

Прэзентуючы кнігу, Умберта Эка рабіў акцэнт менавіта на тым, што гэта будзе абсалютны фікшэн. На яе старонках, па словах пісьменніка, ёсць «падробкі і змовы, эфектныя павароты сюжэту, падзямеллі, поўныя трупаў, караблі, якія ўзлятаюць на паветра пасярод вывяржэння вулкана, забітыя абаты, натарыусы з накладнымі бародамі, сатаністкі-істэрычкі, што адпраўляюць чорныя імшы».

Аднак не натарыусы і не сатаністкі-істэрычкі зацікавілі ў выніку публіку.

На днях блізкая да Ватыкану газета «L'Osservatore Romano» апублікавала гнеўны артыкул, прысвечаны кнізе. На думку газеты, Эка пакрыўдзіў Касцёл і ягоную паству.

«L'Osservatore Romano» піша: «У тым, што тычыцца адсутнасці такту, Эка пераўзышоў сам сябе… Каталікі прадстаўлены ў карыкатурным выглядзе. Няма на старонках кнігі недахопу і ў пантыфіках, якім характэрна тупое супрацьстаянне ўсяму, што звязана з прагрэсам».

Заступілася газета і за яўрэяў: «Нельга адмаўляць, што апісанні яўрэйскай ганебнасці выклікаюць подых двухсэнсоўнасці, што, вядома, было зроблена ненаўмысна. Кожная старонка кнігі прасякнута гэтым. Вымушаны прачытаць агідныя рэчы пра яўрэяў, чытач становіцца сапсаваным антысеміцкім глупствам, і нават, магчыма, хтосьці можа падумаць, што тут ёсць некаторая праўда».

Сапраўды, твор Эка не спадабаўся яўрэйскай грамадскасці, якая на працягу стагоддзя паслядоўна даказвае, што «Пратаколы» — фальшыўка. Між тым, у кнізе сапраўды апісваецца сход яўрэйскіх мудрацоў, які быццам адбыўся ў Празе ў старадаўнім яўрэйскі квартале. На ім абмяркоўваліся планы захопу ўлады ў свеце. Відавочна, што гэта літаратурная выдумка пісьменніка, але….

«Pagine Ebraiche», орган італьянскіх яўрэяў, адзначае: «Эка жадае даказаць фальшывасць «Пратаколаў сіёнскіх мудрацоў». Аднак вынік атрымліваецца іншы. Раман, які накіраваны на тое, каб разбурыць хлусню пра «Пратаколы», наадварот дае новае нараджэнне, выклікае да іх цікавасць».

Свой пункт гледжання на тэму выказаў галоўны рабін Рыма Рыкарда дзі Сеньі: «Чытач можа ідэнтыфікаваць сябе з фальсіфікатарам, які дзейнічае супраць яўрэяў. Урэшце, чалавек, што прачытаў кнігу, так і не разумее: дык хочуць ці не хочуць яўрэі падарваць асновы грамадства і кіраваць светам?»

Сам Умберта Эка, аднак, не пагаджацца з такім падыходам. У інтэрв'ю, дадзеным «Pagine Ebraiche», ён кажа: «Той, хто піша трактат па хіміі, заўсёды можа чакаць, што хтосьці скарыстаецца ім, каб атруціць сваю бабулю. Заўсёды існуюць людзі са злачыннымі схільнасцямі. Аднак я не думаю, што ім абавязкова трэба чытаць мае раманы, каб ажыццяўляць свае ідэі. Усё, што ім трэба, і так знаходзіцца ў вольным доступе, пачынаючы з тых жа «Пратаколаў». Сваёй кнігай я, наадварот, спрабую выкрыць хлусню іх аргументаў… Я напісаў раман, а не эсэ. Мая галоўная ідэя была ў тым, каб захапіць чытача».

У якасці суддзяў у гэтай спрэчцы дадзім слова нейтральным газетам:

*«Timeonline»:* «Крытыка на адрас Эка ўздымае пытанні, якім чынам разглядаць межы рэальнага і фантастычнага. Як ставіцца да персанажаў літаратурных твораў?»

*«Kolot.it»:* «Нельга адмаўляць тое, што частыя апісанні каварных яўрэяў выклікаюць супярэчлівыя думкі, якія наўрад ці хацеў выклікаць Эка. Чытач, аднак, застаецца трохі забруджаны гэтым антысеміцкім вар'яцтвам».

*«Expresso»:* «Напрыканцы твору чытач абавязкова запытае: дык вінаватыя яўрэі ці не? Захапляльная інтрыга кнігі пераконвае ў гэтым».

Між тым, Вольга Кручыніна, якая пераклала на рускую мову кнігі Умберта Эка, праінфармавала прэсу пра тое, што пачынае пераклад «Парыжскіх могілак».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Галоўнае, што хвалюе Лукашэнку, гэта падтрымка яго чацвёртага прэзідэнцкага тэрміну Расіяй. Беларусь вельмі залежыць ад Расіі. Лукашэнка спрабуе стварыць уражанне, што ён не проста можа вырашыць усе праблемы, але і мае рэсурсы паставіць суседа на месца. Ён прадстаўляе сябе вышэй за Мядзведзева і Пуціна. Гэта робіць такое ж самае ўражанне на беларускі электарат, калі б Мядзведзяў раздаваў указы Абаму. Прэзідэнт Беларусі спрабуе даць зразумець: не хвалюйцеся, тое, што я выбіваў з Расіі раней, яна будзе даваць нам і далей. Лукашэнка амаль не кранае пытання пра Захад. Захад, натуральна, эканамічна Лукашэнку дапамагаць не будзе, таму ён спрабуе гуляць на два фронты.

**«Коммерсантъ»(Расія)**

Планы кіраўніцтва Беларусі пра будаўніцтва ў Мінску «Чайна-еаўн» выклікалі рэзкую крытыку ў беларускім грамадстве. Шэраг грамадскіх дзеячаў заявілі пра неабходнасць вынясення дадзенага пытання на рэспубліканскі ці мясцовы рэферэндум. Тым не менш, улады ўжо прэзентавалі макеты будучага аб'екта. У экспертаў выклікае трывогу кепская дэмаграфічная сітуацыя ў рэспубліцы, якая толькі пагоршыцца са з'яўленнем шматлікай кітайскай дыяспары. Вынікі апошняга перапісу насельніцтва паказалі, што ў Беларусі істотнага скарацілася колькасць карэннага насельніцтва. Рускіх і ўкраінцаў у Беларусі стала прыкладна на 30 працэнтаў менш, затое колькасць кітайскай абшчыны за апошнія 10 гадоў вырасла прыкладна ў 20 разоў. У далейшым яна толькі павялічыцца, калі афіцыйны Мінск будзе штучна стымуляваць легальную міграцыю кітайцаў. У той жа час, нагадваюць эксперты, ні ў адной краіне свету не атрымалася вырашыць праблему «кітайскіх кварталаў».

**REGNUM (Расія)**

Здавалася б, яшчэ нядаўна збітая апазіцыя хавалася па кутах, залізваючы раны. А глядзіш — зноў праходзяць пікеты салідарнасці з палітычнымі вязнямі. Родныя зніклых людзей патрабуюць расследаванняў. Гэта іх, безабаронных жанчын і дзяцей, б'юць дзяржыморды ў камуфляжы. А яны ўсё адно патрабуюць расследаванняў. Гэта вельмі шмат значыць. Перш за ўсё, тое, што жывую душу народа, накіраваную да Расіі і Еўропы, рэжым растаптаць не здолеў. Апаненты Лукашэнкі ідуць на выбары. Без надзей на поспех яны паказваюць — мы тут, мы ёсць, нас не зламалі. Яны заклікаюць да неабыякавасці і салідарнасці. Хоць палітычная барацьба і ідзе строга ў рамках, дазволеных рэпрэсіўнай уладай. Гуляеш па правілах — давай. Гуляеш не па правілах — бойся арышту, беражыся аўтамабіля, а лепш — сыходзь з дыстанцыі.

**«Частный корреспондент» (Расія)**

Падвышэнне заробкаў і пенсій з'яўляецца чарговым этапам рэалізацыі абяцання пра павелічэнне сярэдняга ўзроўню заработнай платы да 500 долараў. Гэта мае на мэце павялічыць падтрымку Аляксандра Лукашэнкі перад прэзідэнцкімі выбарамі. Аднак у выніку падвышэння заробкаў павялічыцца нагрузка на бюджэт, і беларускія ўлады будуць вымушаны ў чарговы раз павялічыць дэфіцыт бюджэту. Акрамя гэтага, павелічэнне заробкаў і пенсій стане чыннікам росту інфляцыі, якая па выніках года можа перавысіць закладзеныя ў бюджэце 10% (да верасня інфляцыя склала 6,8%), а таксама павялічыць ціск на валютны рынак, тым больш, што са жніўня 2010 года попыт на валюту значна перавышае продаж. Такія дзеянні пагоршаць стан беларускіх фінансаў, што можа прымусіць улады краіны звярнуцца да ідэі дэвальвацыі рубля напачатку 2011 года.

**«Форум» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ВЕНЕСУЭЛА. УГА ЧАВЕС СТАЎ РЭВІЗІЯНІСТАМ

Унутры Аб'яднанай сацыялістычнай партыі Венесуэлы (PSUV), партыі прыхільнікаў Уга Чавеса, з'явілася фракцыя. Яе стварылі актывісты, якія стаяць на больш левых, чым кіраўніцтва, пазіцыях. Сярод стваральнікаў новай групы Ірыс Варэла — адна з самых вядомых палітыкаў у краіне. У час выбараў прапаганда апазіцыі звычайна звяртае ўвагу на яе радыкальныя левыя заклікі як доказ таго, што Чавес хоча зрабіць з Венесуэлы новую Кубу. Так ці інакш, Ірыс не ў захапленні ад Уга. Інакш яна не стварыла б фактычна апазіцыйную групоўку, якая ў сваіх дакументах называе прэзідэнта «рэвізіяністам рэвалюцыйнага працэсу». Па словах Ірыс, яе група будзе дамагацца таго, каб PSUV займалася «разбурэннем структур капіталізму». Яна таксама заявіла, што партыі пагражае бюракратызацыя. У групу Ірыс ужо запісалася 28 дэпутатаў парламенту.

**Па матэрыялах нямецкай прэсы**

### ПОЛЬШЧА. ЯШЧЭ АДЗІН РУХ

Дзіўным чынам адказаў Яраслаў Качыньскі на апошнія падзеі ў сваёй партыі «Права і Справядлівасць» (PiS). Нагадаем, што не так даўно PiS страціў частку сяброў, аб'яднаных вакол палітыка Ёанны Клузік-Растоўскай. Раскольшчыкі займаюцца перацягваннем да сябе дэпутатаў PiS, стварэннем сваёй арганізацыйнай структуры і падрыхтоўкай да выбараў у Сейм. Каб супрацьстаяць працэсу, Яраслаў вырашыў заснаваць рух у сваю падтрымку. Ініцыятыва пра рух будзе агучана 10 снежня, праз восем месцаў пасля катастрофы пад Смаленскам. Чым той рух будзе адрозніваецца ад партыі, не зразумела. Магчыма, як лічыць прэса, уся справа ў назве, якую збіраецца ўзяць рух. Плануецца назваць яго «Polska Jest Najwazniejsza» (Польшча — гэта самае важнае). Менавіта так называецца група Ёанны Клузік-Растоўскай. Магчыма, ідэя Качыньскага ў тым, каб за кошт блытаніны з назвамі перашкодзіць Клузік-Растоўскай працаваць з электаратам PiS.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

### ГЕРМАНІЯ. 20 ГАДОЎ ПЕРШЫМ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ВЫБАРАМ

Германія адсвяткавала 20-ю гадавіну першых агульнанацыянальных выбараў. 2 снежня 1990 года ўпершыню пасля вайны немцы абралі адзіны парламент. Гэтыя выбары сталі сапраўдным халодным душам для ўсіх партый, акрамя хіба што Хрысціянска-дэмакратычнага саюза. Зараз цяжка сабе ўявіць, што зялёныя, якія цяпер карыстаюцца падтрымкай 20 працэнтаў бюргераў, тады трапілі ў парламент дзякуючы асаблівасцям выбарчага працэсу ў былой ГДР, дзе не было прахаднога бар'еру і, адпаведна, у Бундэстагу было 8 мясцовых зялёных. Тое ж самае здарылася і з партыяй былых нямецкіх камуністаў (PDS). Яна сабрала па краіне дробязь — 2,4 працэнта і таксама змагла выжыць выключна дзякуючы згаданым вышэй асаблівасцям выбарчага кодэкса на Усходзе. Выбары паставілі крыж на кар'еры Оскара Лафантэна, які быў тады лідэрам сацыял-дэмакратаў. Пасля таго, як ружовыя атрымалі толькі 33 працэнты галасоў, Оскар згубіў пасаду кіраўніка і шанец у будучыні стаць канцлерам. На вакантнае месца старшыні адразу паклаў вока амбіцыйны Герхард Шродэр. Затое выбары 1990-га сталі апафеозам папулярнасці Гельмута Коля. Дзякуючы падзенню Берлінскай сцяны Коль стаў у вачах публікі канцлерам адзінства.

**Па матэрыялах нямецкай прэсы**

### РУМЫНІЯ. ЯК ПРАВІЛЬНА НАЗЫВАЦЬ ЦЫГАН?

Румынскі парламент пачаў палеміку на тэму, як дакладна называць румынаў цыганскага паходжання. Дагэтуль у афіцыйных дакументах фігуравала назва «ром». Аднак, на думку некаторых дэпутатаў, слова «ром» занадта блізкае да слова «румын». Гэта, па іх словах, мае негатыўныя наступствы. На Захадзе вельмі часта румынаў трымаюць за ромаў, або цыган. Таму ромы павінны стаць цыганамі. Увогуле, думка памяняць назву «ромы» на «цыгане» ўзнікла яшчэ ў 1990-я, аднак пасля апошняй дэпартацыі румынскіх цыган з Францыі правыя фракцыі зноў актыўна яе лабіруюць. Больш таго: іх праект падтрымала Акадэмія навук. Адзіная праблема ў тым, што ў ЕС усё роўна цыган называюць ромамі.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

### РАСІЯ. БЕЗАЛКАГОЛЬНЫ НОВЫ ГОД




Парламент і кіраўніцтва Санкт-Пецярбургу прыняла рэгіянальную праграму па барацьбе з п'янствам. Праграма будзе дзейнічаць да 2020-га года і павінна кардынальна палепшыць сітуацыю ў гэтай галіне. Галоўным чынам мэта будзе дасягнутая за кошт рознага кшталту сацыяльна-спартовых праграм і поўнай забароны публічнай рэкламы піва. Парламентарыі з берагоў Нявы будуць патрабаваць ад дзяржаўнай Думы адпаведных зменаў у Закон аб рэкламе. Аднак на гэтым вайна з зялёным змеем не закончылася. У дадатак дэпутаты патрабавалі ад мэра Валянціны Матвіенка тэрмінова падпісаць закон, паводле якога ў святочныя дні будзе дзейнічаць «алкагольны каменданцкі час». Крамы будуць гандляваць гарэлкай максімум толькі гадзіну. Напярэдадні святаў гандаль алкагольнай прадукцыя будзе працягвацца пару гадзін. Калі мэр пагодзіцца з прапановай дэпутатаў, то 2011-ы год Піцер сустрэне ў фармаце сухога закону.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

ФУТБОЛ




# FIFA АТРЫМАЛА ХАБАР?

Алег НОВІКАЎ

**Футбольны свет не разумее, якім чынам Расія і Катар здолелі атрымаць права праводзіць чэмпіянат свету па футболу. Прапануем агляд прэсы на гэту тэму.**

Рашэнне пра тое, што Расія і Катар правядуць турніры, адпаведна, у 2018-м і 2022-м годзе, нагадаем, было прынята 2 снежня ў Цюрыху і адразу паставіла на вушы ўсю супольнасць заўзятараў самай папулярнай гульні ў свеце. Ніхто не чакаў такога. Загадзя ўсе лічылі, што турнір 2018 года будзе, хутчэй за ўсё, прымаць у сябе Англія.

Нават пераможцы былі ў шоку. Пра гэта сведчаць каментары ў расійскім сегменце сусветнага сеціва: «Ну что тут сказать... да и говорить ничего не нужно... Это просто офигеть!» Падобная карціна назіралася і ў Катары. Як піша нямецкі «Tageszeitung», мясцовае насельніцтва нават не сачыла за падзеямі ў Цюрыху і толькі пазней зразумела, што адбылася гістарычная з'ява.

Што да спецыялістаў, яны дружна лічаць, што расіяне і арабы далі чыноўнікам FIFA хабар. Тым больш, што напярэдадні брытанскія медыя ў рамках журналісцкага даследавання прапанавалі некаторым клеркам хабар за прызначэнне чэмпіянату ў ЗША. Тыя ахвотна давалі згоду. Скандал дорага каштаваў іміджу FIFA. І цяпер яна помсціць.

Натуральна, Англія пратэстуе. Мэр Лондану Барыс Джонсан заявіў, што FIFA ў сваім цяперашнім выглядзе папросту не павінна далей існаваць. Былы трэнер зборнай Англіі Грэм Тэйлар лічыць, што дзейнасць FIFA неабходна расследаваць у судзе.

«Рамантызм англійскай заяўкі сутыкнуўся з камерцыйнай жылкай FIFA, якая марыць пра капіталы былых савецкіх рэспублік і багатых нафтай арабскіх краінаў», — выказвае думку англійскіх аматараў футболу «The Guardian». Іншыя выданні называюць выбар FIFA нават нацыянальнай крыўдай для брытанцаў.

Дасталася і ўраду. Лейбарысты, якія знаходзяцца ў апазіцыі, абрушыліся з крытыкай на прэм'ер-міністра. Ён, па іх словах, «крывадушнік», які спыняе фінансаванне фізкультуры ў школах і ў той жа час падтрымлівае англійскую заяўку ў Цюрыху.

«The Times» прыводзіць словы апраўдання прэм'ера. Ён кажа пра тое, што «ў Англіі была лепшая заяўка з тэхнічнага і камерцыйнага пунктаў гледжання, краіна жыве футболам, але, як высвятляецца, гэтага недастаткова».

Далей больш. «The Daily Telegraph» лічыць, што Расія не мае права прымаць вялікі футбол без адпаведных дэмакратычных рэформаў. «Для таго, каб Расія годна прыняла чэмпіянат, ёй неабходны фундаментальныя змены. У прыватнасці, ёй трэба шырэй расчыніць вокны на Захад. Ёй неабходны культурныя змены, гатоўнасць прыняць свет ва ўсёй яго разнастайнасці». Газета згадвае таксама пра праблему расізму ў расійскім футболе.

Падтрымлівае гэты тэзіс і расійская апазіцыя. Нацыяналістычны сайт АПН піша: «Права на правядзенне чэмпіянату свету ў Расіі — чарговая прапагандысцкая бурбалка, прызначаная выключна для ўнутранага карыстання. Можна не сумнявацца, рашэнне FIFA будзе паднесена як грандыёзны міжнародны поспех, «чарговы доказ узмацнення ролі і ўплыву Расіі ў свеце». Прычым, трэба заўважыць, што памер гэтых бурбалак, якія рэгулярна надзьмуваюць ужо дзесяць гадоў, у апошнія гады стаў прыкметна больш дробным.

Негатыўна ўспрымае Кубак свету–2018 і ліберальны сайт «Каспаров.ру»: «Замест таго, каб укладваць грошы ў закупку новых тэхналогій, развіццё вытворчасцяў, Расія будзе ўбіваць мільярды долараў на стадыёны ў правінцыйных гарадах. Ну і плюс не менш паловы ад гэтых грошай у выглядзе адкатаў з'явяцца на замежных рахунках расійскіх спартыўных функцыянераў. На грошы, якія пойдуць на Алімпіяду і чэмпіянат свету, можна было б насельніцтва краіны павялічыць, дапамагаючы шматдзетным сем'ям».

Цікава, што расійскую супольнасць не радуе абяцанне чыноўнікаў пра тое, што Мундыяль–2018 будзе на галаву вышэй за польска-ўкраінскае Euro–2012.

Тым часам «The New York Times» нават правяла расследаванне. Газета задаецца пытаннем, што падштурхнула FIFA зрабіць выбар на карысць Расіі і Катара, і адказвае: «Палітычная перавага Уладзіміра Пуціна і бяздонныя нафтавыя рэсурсы Катару былі ключавымі фактарамі падчас гандлю». Нягледзячы на заявы FIFA, выданне выяўляе ў механізме прыняцця рашэння больш палітычныя і фінансавыя стымулы, што, на ягоную думку, можа супярэчыць Статуту FIFA. Адну з галоўных роляў, па меркаванні прэсы, адыграў Чак Блэйзер — амерыканец, які адказвае ў арганізацыі за маркетынг і тэлебачанне. Блейзер і Пуцін сустрэліся ў жніўні гэтага года ў Маскве і, паводле версіі «The New York Times», менавіта тады была заключаная дамова з д'яблам.

«Расія навучыла Вялікабрытанію, як гуляць у палітыку з FIFA», — робіць рэзюме газета.

Сапраўды, гісторыя цёмная. Цяжка не пагадзіцца з «The Independent», якая не разумее, «як з лепшай па адзнацы экспертаў FIFA тэхнічнай і камерцыйнай заяўкай брытанцы маглі набраць усяго толькі два галасы».

У дадатак 6 снежня ў інтэрв'ю газеце «Спорт-экспрэсс» былы прэзідэнт Расійскага футбольнага саюза Вячаслаў Каласкоў прызнаў, што Пуцін сустракаўся са спартовымі чыноўнікамі падчас кампаніі за правядзенне чэмпіянату свету па футболе 2018 года ў Расіі. Аднак дэталі ён распавесці адмовіўся.

На гэты момант цяжка прагназаваць, ці паўплываюць падазрэнні ў карупцыі FIFA на перагляд вынікаў. Але паколькі ні арабскі свет, ні постсавецкая прастора яшчэ не прымалі турніры ўзроўню чэмпіянату свет, іх правядзенне дасць імпульс развіццю мясцовага футболу.

«Канешне, грошай шмат раскрадуць, але хоць стадыёны і дарогі пабудуюць», — аптымістычна адзначыў ананімны расійскі блогер.

ЦІКАВА

# ЦІ ТРЭБА БАЯЦЦА ЧАЙНА-ТАЎНАЎ?

Алег НОВІКАЎ

**Нечакана адной з тэмаў цяперашняй выбарчай прэзідэнцкай кампаніі стаў праект «Чайна-таўн» — кітайскі квартал, які збіраюцца пабудаваць у сталіцы. Апазіцыя кажа: гэта кепска. Улада — добра. А што гаворыць сусветны вопыт?**



У час выбараў сфармавалася два падыходы. Кандыдат Алесь Міхалевіч адзначыў «неабходнасць інфармавання грамадскасці пра наступствы, да якіх можа прывесці інтэнсіфікацыя кантактаў Беларусі з сучасным Кітаем». Апаніруючы такому падыходу, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Людзі едуць да нас з дабром. Што кепскага, калі Кітай адчыніць сваю культуру Беларусі?»

Перш за ўсё, у цэнтры набіраючай ход палемікі апынуўся праект комплексу жылых і сацыяльных аб'ектаў, які будзе пабудаваны ў Мінску кітайскімі працоўнымі і галоўных чынаў з кітайскіх будаўнічых матэрыялаў. Іншымі словамі, у нас можа ў хуткім часе ўзнікнуць свой Чайна-таўн. Па афіцыйнай прэсе ўжо гуляе тэма пра «мінскі Пекін».

Чайна-таўн — спалучэнне англійскіх слоў «China» (Кітай) і «town» (горад) — назва кітайскіх этнічных анклаваў у замежных гарадах. Чайна-таўны можна сустрэць па ўсім свеце: ад Масквы да Пхеньяна. Самы вялікі на цяперашні дзень кітайскі квартал — нью-ёркскі Чайна-таўн, дзе жыве больш за 600 тысяч чалавек. Гэта без уліку таго, што ў горадзе яшчэ тры малых Чайна-таўна.

Непасрэдна станаўленню сеткі Чайна-таўнаў папярэднічаў Пекінскі трактат, які ўрад імперыі Цын падпісаў з заходнімі дзяржавамі ў 1860 годзе. Адпаведна яму кітайцы атрымалі права вольна пакідаць радзіму. Хаця самыя старыя Чайна-таўны на планеце — у Нагасакі (Японія) і ў Бангкоку (Тайланд) былі заснаваныя больш за 200 гадоў таму.

У Еўропе кітайская эміграцыя фармавалася з былых маракоў, якія заставаліся ў мясцовых партах і зараблялі грошы за кошт таго, што аказвалі землякам паслугі перакладчыкаў або юрыстаў. Прарыў быў зроблены ў Брытаніі, якая завербавала вялікую групу кітайцаў на гандлёвы флот. Як следства, у Ліверпулі і Лондане з 1890 года пачынаюць узнікаць кітайскія калоніі. Такім жа чынам — у якасці запрошаных гастарбайтэраў — кітайцы дабраліся да Парыжу. Ва Усходняй Еўропе азіяцкія камуны фармаваліся на базе в'етнамскіх працоўных, якіх завезлі сюды ў рамках эканамічнай дружбы з гераічным В'етнамам.

Чайна-таўны — не статычная з'ява. Яны як жывыя арганізмы: паміраюць, рухаюцца, адраджаюцца. Так, праз эканамічны бум у Каліфорніі на пачатку XX стагоддзя рыэлтэры паклалі вока на кітайскі квартал у цэнтры горада. У выніку раён паступова стаў турыстычным, хаця і захаваў старую назву. Між тым, сапраўдны Чайна-таўн — месца, дзе кампактна жывуць кітайскія імігранты, перакачаваў на поўдзень горада. Ледзь не сканаў у свой час згаданы вышэй Чайна-таўн у Нью-Ёрку. Першыя кітайцы прыйшлі на Манхэтан у 1870 годзе, і іх колькасць стала расла да 1943-га, калі ўрад кардынальна скараціў іміграцыйную квоту для кітайскіх грамадзян. Калонія перажывала заняпад да 1968 года, калі квоту зноў пашырылі. У тых жа старых амерыканскіх Чайна-таўнах апошнімі гадамі назіраецца адток моладзі. У трэцім-чацвёртым пакаленні прадстаўнікі эміграцыі дастаткова добра інтэграваныя ў мясцовае грамадства і могуць, асабліва моладзь, выжыць самастойна. У Чайна-таўнах часам застаюцца толькі старыя.

Што ўяўляе сабой звычайны Чайна-таўн? Па-першае, ён вылучаецца архітэктурным стылем. На ўваходзе ставяць прыгожыя вароты, на тратуарах можна сустрэць так званых Paifang (скульптуры льва). Будынкі намагаюцца рабіць з элементамі азіяцкага дызайну. Аднак гэта не норма.

Трэба прызнаць, што Чайна-таўны — гэта дзяржава ў дзяржаве. Тут размаўляюць як на афіцыйнай мове, так і на кітайскай. Нават тэксты на банкаматах звычайна напісаныя на дзвюх мовах. Некаторыя знаёмыя з Сінявокай, якіх заносіла ў Чайна-таўн Нью-Ёрку, кажуць, што там бездань людзей, якія не ведаюць англійскай мовы.

Якія прафесіі характэрныя для жыхароў Чайна-таўнаў? Эмігранты трымаюць танныя рэстараны з традыцыйнай кітайскай кухняй, маленькія сувенірныя крамы, казіно, клубы і масажныя салоны. Аднак пры гэтым галоўнай візітнай карткай кварталаў лічыцца кухня. У Чайна-таўнах развіты малы бізнес. Галоўным чынам гандаль імпартнымі таварамі паўсядзённага спажывання. Хапае вулічных гандляроў. Еўрапейцы ахвотна наведваюць Чайна-таўны, каб набыць экзатычныя лекі ўсходняй медыцыны. Абавязковы элемент кожнага Чайна-таўну — вялікі рынак садавіны.

Паколькі сярод кітайцаў шмат будыстаў, тут можна сустрэць будысцкіх манахаў і крамы, дзе прадаюцца прадметы культу.

У сацыяльным жыцці Чайна-таўнаў вялікую ролю адыгрывае сям'я. Сем'і фармуюць сямейныя асацыяцыі, якія дапамагаюць адна адной і арганізуюць рознага кшталту святочныя мерапрыемствы, збіраюць грошы на ўтрыманне старых, разам шыюць касцюмы да кітайскага новага году — самае вялікае свята ў Чайна-таўнах, якой прыцягвае шмат людзей.

Натуральна, сярод эмігрантаў ёсць злачыннасць. Яна сфармавалася яшчэ ў XIX стагоддзі на базе групы самаабароны, якія абаранялі камуну ад мясцовых або іншых этнічных бандаў. Паступова тыя групоўкі сталі сакрэтнымі злачыннымі арганізацыямі, кшталту славутай Трыяды. На пачатку XX стагоддзя па Чайна-таўнах пракацілася г. зв. «Войны тонга» — разборкі паміж рознымі кланамі мафіі за кантроль над тэрыторыяй. Паколькі эміграцыя з Азіі вельмі мабільная, тыя мафіёзныя войны працягваюцца да цяперашняга дня.

Часам турысты могуць трапіць пад раздачу. У 1983 годзе ў Сіэтле было забіта 13 наведвальнікаў картачнага клубу (праўда, клуб быў нелегальны). Але такія інцыдэнты можна пералічыць на пальцах адной рукі. Звычайна кітайская мафія працуе са сваімі суайчыннікамі. Яна трымае транзіт нелегальных эмігрантаў на Захад, прастытуцыю, гандаль наркотыкамі. І зноў жа шмат залежыць ад геаграфіі. У Гаване або Маскве Чайна-таўн — дастаткова мірнае месца.

Папулярная думка пра тое, што Чайна-таўны — гэта своеасаблівы плацдарм для працы кітайскіх спецслужбаў за мяжой. Аднак, як дэманструе статыстыка па ЗША, дзе Чайна-таўнаў вельмі шмат, кітайская разведчыкі намагаюцца працаваць праз студэнтаў, паколькі займаюцца галоўным чынам тэхналагічным шпіянажам. Цікава, што самыя буйныя кітайскія камуны ў Штатах увогуле не вызнаюць КНР, падтрымліваюць Кітайскую Рэспубліку (Тайвань).

Вось у агульных словах, што ўяўляюць Чайна-таўны. Ці патрэбныя яны ў Мінску — вырашаць мінчукам. Галоўнае, каб выбар быў свабодны.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ХОСНІ МУБАРАК



Прэзідэнт Егіпту ў наступным годзе, пасля 29 гадоў кіравання краінай, збіраецца скласці паўнамоцтвы з прычыны саліднага ўзросту (яму пайшоў 83-ці год). Аднак перад тым, як пайсці на пакой, ён паказаў маладняку, як трэба праводзіць выбары ў аўтарытарнай краіне. 5 снежня адбыўся другі тур выбараў у парламент, па выніках якога 95 працэнтаў месцаў атрымала ўрадавая Нацыянальна-дэмакратычная партыя (NDP). Праўда, часткова гэтаму спрыяў сімвалічны жэст дзвюх вядучых партый апазіцыі — «Вафд» і «Браты-мусульмане». Дысідэнты на знак пратэсту супраць фальсіфікацый у першым туры вырашылі не ўдзельнічаць у другім туры. Трэба, аднак, прызнаць, што сумна ў новым парламенце не будзе. З-за таго, што Мубарак ідзе на пенсію, унутры NDP імкліва абвастраецца барацьба паміж 2–3 палітыкамі за права быць галоўным партыйным кандыдатам на прэзідэнцкіх выбарах. Што да апазіцыі, то яе перспектывы незразумелыя. Адзінае, можна паспрабаваць пагуляць на супярэчнасцях у NDP і падтрымаць нейкага кандыдата, атрымаўшы штосьці ўзамен. Свайго кандыдата апазіцыянерам будзе выставіць вельмі цяжка. Па мясцовых законах, кандыдата можа выстаўляць партыя, якая мае ў парламенце фракцыю памерам як мінімум у 5 працэнтаў. Другі варыянт — сабраць 250 пісьмовых лістоў падтрымкі ад прадстаўнікоў розных адміністрацый. Паколькі ў краіне ўсім кіруе NDP, такі варыянт нерэальны. Выбары прэзідэнта краіны адбудуцца наступным вераснем.

### МІХАІЛ БРОДСКІ



Украінскі палітык, кіраўнік камітэту па развіццю прадпрымальніцтва пры кабінеце Азарава, даўно праславіўся на ўсю Украіну тым, што за словам у кішэню не лезе. Ён можа ў вочы разануць усё, што думае пра любога, прычым карыстаючыся амаль ненарматыўнай лексікай. Палітычныя шоў на тэлебачанні з яго ўдзелам — заўсёды гарантаванае эмацыйнае паліванне брудам апанента. Магчыма таму, што палітыкаў, якіх размазваў Бродскі, не моцна любілі, народ Міхаілу такія нумары прабачаў. Аднак апошняя выхадка Міхаіла зрабіла з яго ізгоя ў вачах народных мас. Спачатку трэба згадаць, што на днях міліцыя разагнала на Майдане лагер прадпрымальнікаў, якія выступалі супраць прыняцця новага падатковага кодэксу. Каментуючы расправу, Бродскі сказаў, што калі яны (бізнесмены) не возьмуць касавых апаратаў (іх увядзенне прадугледжана новым законам), усім будзе ўзняты пенсійны ўзрост. Такі адкрыты шантаж выклікаў вельмі адмоўную грамадскую рэакцыю. Удзельнікі шматлікіх інтэрнэт-форумаў патрабуюць ад Януковіча выключыць «хама» з ураду. Самае цікавае, што, калі верыць СМІ, пастанова пра звальненне Міхаіла даўно прэзідэнтам падпісаная. Проста ён чакае патрэбнага часу. Разгон бізнесменаў вельмі моцна настроіў грамадства супраць Партыі Рэгіёнаў. Прэм'ер Азараў, які прыйшоў у кіеўскі Оперны тэатр, быў асвістаны гледачамі. Між тым, пасля падатковай, на носе запланаваная пенсійная і камунальная рэформа.

### НУРСУЛТАН НАЗАРБАЕЎ



Прэзідэнт Казахстану зноў марыць пра эліксір, які дазволіць жыць вечна або хаця б працягнуць ягонае жыццё. Пра неабходнасць стварэння такога сродку ён заявіў падчас выступу перад настаўнікамі і студэнтамі ўніверсітэту імя сябе любімага. Сустрэча была адказам на вечарыну з нагоды ўручэння Нобелеўскай прэміі міру, якая адбылася ў той жа дзень. Прэмію атрымаў кітайскі дысідэнт, а ствараць канфлікты з Пекінам Астана не жадае. Назарбаеў ускосна закрануў тэму Нобелеўскай прэміі, аднак цвіком яго выступу была тэма пра цудоўны эліксір. Па словах прэзідэнта, «людзі яго пакалення з нецярпеннем чакаюць адкрыццяў у вобласці падаўжэння жыцця». Палітык, якому зараз 70 гадоў, пачаў казаць пра гэта ў мінулым годзе. Ён гаворыць, што калі эліксір будзе знойдзены, ён гатовы заставацца на пасадзе прэзідэнта да 2020 года. Ну а пакуль рэцэпту эліксіру няма, Назабаеў не супраць атрымаць Нобелеўскую прэмію міру. Асамблея цюркскіх народаў ужо вылучыла яго на конкурс лаўрэатаў Нобеля–2011.

▸ СПАДЧЫНА

# ВАЛЬТЭР КІТ — СЫН БАРЫСА КІТА

Андрэй МАЙСЯЁНАК, прафесар, Гродна

**Больш за год таму беларуская дыяспара страціла аднаго з найбуйнейшых сваіх прадстаўнікоў, на жаль, малавядомага на Бацькаўшчыне, — Уладзіміра (Вальтэра) Кіта, намесніка адміністратара Цэнтра па экспарту NASA (National Aeronautics and Space Administration), доктара навук, сына знакамітага прафесара матэматыкі і даследчыка ракетнага паліва, акадэміка Барыса Уладзіміравіча Кіта.**



Андрэй Майсяёнак

Незадоўга да таго Уладзімір Кіт выйшаў на пенсію і пераехаў са штаб-кватэры NASA ў Вашынгтоне ў лагодны Сіэтл, што знаходзіцца ў штаце Вашынгтон недалёка ад ціхаакіянскага ўзбярэжжа ЗША. Яго смерць стала цяжкім выпрабаваннем для сям'і і блізкіх і, зразумела, для 100-гадовага Барыса Кіта, які адзначыў юбілей 6 красавіка 2010 года з цяжкім сэрцам.

Вось што гаворыцца ў некралогу, апублікаваным удавой Уладзіміра ў буйнейшай газеце Злучаных Штатаў «The Washington Post»: «Памёр Вальтэр Кіт у сераду, 4 лістапада 2009 года ў Сіэтле, штат Вашынгтон. Самы дарагі і ўкаханы муж Марго Шэнет, любячы бацька Марыны Алмулер. Выдатны інтэлектуал, аматар оперы, ігрок у тэніс, нядаўні супрацоўнік NASA. Яго вельмі будзе нам не хапаць. Мемарыяльныя ахвяраванні могуць быць пералічаны на адрас Pancreatic Cancer Action network. Мемарыяльная служба адбудзецца пазней».

Памёр Уладзімір Кіт ад рака падстраўнікавай залозы на аперацыйным стале, падчас паўторнага хірургічнага ўмяшання.

* * *

А нарадзіўся ён у Беларусі. Вось урывак з успамінаў маці Уладзіміра Кіта: «4 лістапада 1941 г. радзіўся сын у бацькоў Барыса Уладзіміравіча і Ніны Корсак у Лебедзеве, раён Маладзечна, Беларусь. У гэты перыяд сям'я Кіт жыла ў бацькоў Ніны — Івана Сцяпанавіча і Наталлі Максімаўны Корсак. Пасля другой сусветнай вайны сям'я Кіт пераехала ў Злучаныя Штаты Амерыкі ў лютым 1948 г. Два гады жылі на ўсходзе Амерыкі ў мястэчку Саўт-Рывер (New Gerscy). У 1950 годзе летам пераехалі ў Каліфорнію і жылі ў Норд Галівуд, дзе Вова хадзіў у школу і дзе ён навучыўся гуляць у тэніс. Гэты спорт ён любіў і гуляў да канца жыцця. У 1950 годзе, 16 снежня, нарадзіўся ў іх другі сын, брацік у Вовы, Віктар.

У 1958 г. сям'я пераехала на ўсход Амерыкі, у Марыланд. Там Вова закончыў сярэднюю школу і быў прыняты ў Джорджстаўнскі ўніверсітэт на тэнісовую стыпендыю. Ён закончыў гэты ўніверсітэт у 1964 г. са стужкай бакалаўра са школы замежных спраў. Другі BS (ступень бакалаўра) ён атрымаў у 1968 г. і MS (ступень магістра, A.M.) з «George Washington» універсітэту. На апошняй працы ў 2002 годзе ён атрымаў ступень доктара з «Engineering Menagement». Увесь час ён працаваў у дзяржаўных установах. Апошнія 22 гады ён працаваў для NASA, як «menager of information technology policy and planning».

Першае сужэнства Уладзіміра Кіта, на жаль, скончылася разводам. У 1986 годзе Вова ажаніўся другі раз з Марго Шэнет. Яны пражылі шчасліва 24 гады. У верасні 2009 г. яны выйшлі на пенсію і выехалі ў штат Вашынгтон. Вова захварэў на рак падстраўнікавай залозы. 4 лістапада 2009 г. ён памёр, акурат на свой дзень нараджэння. Яму было 68 год...»

* * *

У навуковым асяроддзі Уладзімір Барысавіч Кіт быў вядомы як Вальтэр Кіт. Атрымаў амерыканскае грамадзянства ў 1958 годзе. Яго працоўны шлях увесь час пралягаў у Вашынгтоне: спачатку ў Міністэрстве арміі, Міністэрстве камунікацый і, нарэшце, у NASA. Яго галоўны накірунак дзейнасці — каардынацыя экспарту вынаходстваў і адкрыццяў у галіне касманаўтыкі.

Выхаваны ў беларускамоўнай сям'і, ён валодаў рафінаванай беларускай мовай, якой вольна карыстаўся ў беларускамоўным асяроддзі. У 1960-х гадах па прапанове Міністэрства інфармацыі ЗША ён удзельнічаў у якасці асістэнта кіраўніка выставы «Амерыканская архітэктура» у СССР (дырэктарам выставы была жонка Уладзіміра — Тамара Кіт, у той час супрацоўніца Міністэрства інфармацыі). Падчас адкрыцця выставы ў Мінску Уладзімір Кіт шакаваў савецкіх чыноўнікаў сваёй прамовай і вядзеннем экскурсій на беларускай мове, якой ніхто з іх не валодаў. Наведвальнікі выставы былі ўражаны прыгажосцю і сакавітасцю беларускамоўных аповедаў маладога амерыканца. Яны не ведалі, што перад імі сапраўдны беларус.

У 1970-х гадах Уладзімір Кіт быў камандзіраваны ў арабскі свет, Каралеўства Саўдаўская Аравія, па міжурадаваму пагадненню, дзе кіраваў распаўсюджваннем камп'ютарных тэхналогій у гэтай арабскай краіне. Па вяртанні ў ЗША ўвесь час працаваў у галіне трансферу тэхналогій і камерцыялізацыі распрацовак NASA. Дарэчы, гэта стала тэмай яго доктарскай дысертацыі, абароненай 19 мая 2002 года ў The George Washington University.



Сям'я Барыса Уладзіміравіча Кіта ў 1976 г. у дзень вяселля малодшага сына Віктара: злева направа — Тамара (нявестка), Барыс Уладзіміравіч Кіт, Віктар, Ніна Іванаўна, Марына (дачка Уладзіміра) і Уладзімір Барысавіч Кіт



Уладзімір Кіт у дзяцінстве

Аналіз трансфераў праграмнага забеспячэння і камерцыялізацыя пяці галоўных цэнтраў NASA ў іх параўнанні з нацыянальнымі лабараторыямі Міністэрства энергетыкі ЗША дазволіў Уладзіміру Кіту зрабіць высновы аб ролі і эфектыўнасці партнёрскіх дамоўленасцей, мэтанакіраванай інфармацыі пра новыя тэхналогіі праграмнага забеспячэння, аб значэнні стымулу ўзнагароджвання.

Рэалізацыя прапаноў дысертанта значна падвысіла эфектыўнасць камерцыялізацыі распрацовак NASA, узровень ліцэнзавання праграмнага забеспячэння і атрымання прыбытку за інтэлектуальны прадукт.

Як кажуць, доктар Вальтэр Кіт апынуўся на «сваім месцы». Атрыманы ў спадчыну матэматычны талент бацькі, знакамітага сваім абгрунтаваннем плыўкага вадароду ў якасці ракетнага паліва, у спалучэнні з мэтанакіраванай працай далі свой плён у новай сферы.

Як часта бывае з таленавітымі людзьмі, Уладзімір быў таленавітым ва ўсім. У прыватнасці, у музыцы. Гэта ўжо спадчыннасць ад маці — Ніны Іванаўны (10 жніўня 2009 года ёй споўнілася 90 гадоў), з роду Лебедзеўскіх-Корсакаў, аматараў капельнага спявання і народнай музычнай культуры.

Сам Уладзімір не знайшоў часу, каб рэалізаваць свае музычныя здольнасці, якія ён дэманстраваў выдатна валодаючы фартэпіяна. Але гэта быў меламан высокага гатунку, прысутны амаль на ўсіх оперных прэм'ерах. А вось для адзінай дачкі яго — Марыны — музыка стала прафесіяй. Яна паспяхова скончыла балетную студыю і школу і была выбрана ў ліку 5 балерын (з 350 студэнтак) у балетную трупу славутага Нурыева, калі ён разам з рэжысёрам Пановым ставіў «Ідыёта» па Дастаеўскаму ў Вашынгтоне.

Пра іншыя здольнасці Уладзіміра (ці, як яго называлі ў сям'І, Вовы) успамінае бацька Барыс Уладзіміравіч: «...У свае маладыя гады ён шмат займаўся спортам, асабліва тэнісам, у якім быў вельмі паспяховым. Лічыўся адным з найболып выдатных маладых амерыканскіх тэнісістаў. Як, напрыклад, падчас студыяў ва ўніверсітэце Джорджтаўн у Вашынгтоне на працягу 4-х гадоў займаў становішча першага іграка ў тэніснай групе і ў такой якасці рэпрэзентаваў універсітэт ва ўсіх амерыканскіх спаборніцтвах таго часу паміж універсітэтамі, атрымліваючы перамогі і адпаведныя ўзнагароды. Аб гэтым было паказана ў газетах тых часоў. Граў у тэніс да апошніх дзён свайго жыцця».

* * *

У мінулым годзе мы абмяркоўвалі з Барысам Уладзіміравічам Кітом праграму візіту яго старэйшага сына ў Беларусь. Праца яго ўжо не стрымлівала і можна было падумаць пра сумесную вандроўку ў родныя мясціны. Хацелі разам убачыць у Маладзечне знакамітага хармайстра і кампазітара Іосіфа Сушко, які ў свой час кіраваў Лебедзеўскай капэлай, а ў ваеннае ліхалецце быў... вучнем Барыса Кіта ў Пастаўскай настаўніцкай семінарыі. Мне, дарэчы, давялося вучыцца на баяне і спяваць у Варапаеўскіх хорах пад кіраўніцтвам Іосіфа Фаміча Сушко таксама на Маладзечаншчыне.

Свет, сапраўды, вельмі цесны, але ж у ім ёсць пачэснае месца для нашых землякоў, якія сваім талентам, працавітасцю, няўрымслівасцю даказалі сваю чалавечую і нацыянальную годнасць. Шкада, што некаторым з іх не хапіла месца ў Беларусі.

У Нацыянальнай акадэміі навук паспяхова дзейнічае Парк высокіх тэхналогій. Не вядома, ці мелі нашы маладыя спецыялісты праграмнага забеспячэння кантакты з NASA, але нішто не перашкаджае ім пазнаёміцца з навуковымі даследаваннямі Уладзіміра (Вальтэра) Кіта, якія, безумоўна, не страцілі сваёй актуальнасці ра сённяшні дзень.

Прафесар Барыс Кіт вельмі ганарыцца сваім сынам, яго навуковымі і службовымі дасягненнямі, называючы яго «сучасным Дамейкам». Гэта параўнанне двух вучоных — прадстаўнікоў розных эпох, але ўраджэнцаў аднаго рэгіёна — справядлівае. Аднак узмацню яго: нацыянальны герой Чылі адносіў сябе да польскай традыцыі, а Уладзімір Кіт заўсёды лічыў сябе беларусам. І будаваў сваё жыццё ў сучасным высокатэхналагічным постіндустрыяльным амерыканскім грамадстве, займаючы высокае становішча ў сусветна знакамітай NASA. У поўнай ступені ажыццявіўшы «амерыканскую мару».

ДА 140-ГОДДЗЯ

# ФЕНОМЕН МАСТАКА ФЕРДЫНАНДА РУШЧЫЦА

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**Бліжэй да Калядаў выставай адной карціны ў Доме Ваньковічаў будуць адзначаць 140-я ўгодкі з дня народзінаў Фердынанда Рушчыца (10.12.1870–30.10.1936). Нацыянальны мастацкі музей Беларусі і Інстытут Польскі ў Мінску збіраюцца правесці мерапрыемства больш грунтоўнае, з адведзінамі магілы мастака ў вёсцы Багданава перад Вялікаднём. «Новы час» згадвае мастака сёння, у дзень яго народзінаў, тым больш, што беларускія знаўцы не часта пішуць пра яго. Хаця феномен Рушчыца так і не разгаданы.**



Фердынанд Рушчыц. Зямля. 1898 г.



Фердынанд Рушчыц

## Радавод

Паходзіў Фердынанд Рушчыц з Рошчыцаў, з праваслаўнага беларускага старажытнага шляхецкага роду (герб Ліс), які праз веру "грэцкую" (уніяцтва) і кальвінізм у часы Рэчы Паспалітай прыйшоў да каталіцызму. Па сведчанні дачкі Яніны, «элін па натуры», Рушчыц уважаў сябе за «тутэйшага». У гэтым ментальным самавызначэнні, апрача прыхаванага каліўца гаротнай жыццёвай хітрынкі «бездзяржаўных» праваслаўных і каталікоў, адбілася імкненне адасобіцца ад «старэйшых» суродзічаў.

Сын служачага Лібава-Роменскай чыгункі скончыў гімназію ў Мінску ў 1890 годзе з залатым медалём і тут жа атрымаў досвед малявання ў выхаванца Пецярбургскай акадэміі мастацтваў Кузьмы Ермакова. Пра Мінск Фердынанд у сваім дзённіку пазней зазначыць: «Пасля ўсяго таго, што прыходзілася перажываць у сваёй прафесійнай дзейнасці ў мастацкім цэнтры, тут маральна адпачываю… Думаю пра будучыню».

## Пошукі і знаходкі

Самым актуальным для ўзнёслага выхадца з Паўночна-Заходняга краю быў пошук настаўніка. Прымераўшы форму студэнта-юрыста Пецярбургскага ўніверсітэта і ўпэўніўшыся, што «гэта не тое», у 1891 годзе Фердынанд падаў прашэнне ў Акадэмію мастацтваў пра залічэнне вольным слухачом. Кіраўнік майстэрні мастак Іван Шышкін адчуў неардынарнасць юнака і быў з ім уважлівым і далікатным, скіроўваў яго талент у рэчышча марынізму, імкнучыся зрабіць з яго другога Айвазоўскага. Па намаўленні прафесара Рушчыц двойчы ездзіў у Крым, наведаў выспы Руга і Барнгольм на Балтыцы.

Не ведалі мэтры, што апрача эстэтычных уражанняў, якія фіксаваліся ў таропкіх эскізах ды закончаных эцюдах, з наведваннем кожнай мясціны, ад новых, балюча-рэалістычных назіранняў і роздумаў стыхійны, неўсвядомлены яшчэ неспакой душы мацнеў і гартаваўся ў светапогляд асобы.

Ён занатоўваў у дзённіку: «Балаклава… І тут русіфікуюць колькі могуць. Тры храмы — і адзін святар, які толькі па-руску правіць набажэнства. У школе таксама толькі руская мова. Здабыткі з гэтага будзе мець адно Расійская дзяржава, але для гісторыі, этнаграфіі, нарэшце, і мастацтва, гэткая скіраванасць будзе страхатліва нуднай… Тут, дзе столькі было народаў, дзе столькі захавалася традыцый!» Рэчаіснасць ірвала і крывавіла сэрца, «але з ранай паглыблялася і любоў — адно-адзінае вялікае, святое і вечнае».

## Чаго прагне душа

Бракавала Рушчыцу кантактаў з маэстра, у якога ён аваладваў малюнкам — «арыфметыкай» мастацтва. Сцюжай павявае ад словаў у дзённіку: «Адчуваю сябе ў прафесіі поўным сіратой. Шышкін сімпатызаваць мне не можа, а калегі заўжды застануцца калегамі». Пасля аднаго з візітаў да прафесара, які ўхваліў ягоныя летнія працы, Рушчыц запісаў: «Няўжо яны ніколі не зразумеюць, што я магу быць не толькі прылежным адэптам мастацтва, але і нешта сваё, новае магу даць! Няўжо ў мяне столькі памылак, што музычнасць, якую я ў сабе адчуваю, не заўважная ў маіх карцінах? Я адчуваю, што ў мяне ёсць дар Божы…»

Пакліканне да мастацтва, якое Фердынанд усведамляў з дзяцінства, мацавалася неперарыўнасцю гістарычнай памяці, традыцыямі, трывалым этычным грунтам высакароднай сям'і, «роднага гнязда», шчырай Верай. У Зямлю. У Касцёл. У Неба.

Рушчыц не проста шукаў настаўніка, які б дапамог «перайсці да абагульнення — да алгебры, кампазіцыі», але марыў пра настаўніка-сябра, здольнага зразумець яго «ўсім сэрцам», якому можна «даверыцца ўсёй душою».

## Настаўнік і вучні

Аддадзім належнае Куінджы, мастаку і педагогу ад Бога, да якога Рушчыц перайшоў у 1895 годзе. Менавіта са школай Куінджы звязваюць аўтарытэты росквіт творчасці беларускага мастака.

Грэк па нацыянальнасці, Архіп Куінджы, у сям'і якога гаварылі па-татарску (па метрыцы Ямэнджы — у перакладзе «працоўны чалавек»), у мастацкай культуры XIX–XX стагоддзя зацвердзіў новы накірунак пейзажнага жывапісу — «рамантызуюча-намыслены». Даследнікі тлумачаць навацыі Куінджы (школа «дзікай прыроды») якасцямі самога педагога, што спагадліва ставіўся да пошукаў моладзі, не навязваў сваіх меркаванняў і тэхнічных прыёмаў, не перашкаджаў выяўленню асабістых рысаў натуры, вучыў творчасці, а не капіяванню.

Сувекцце імёнаў — Рэрых, Рылоў, крымскі мастак Багаеўскі, «пясняр Карпатаў» паляк Урублеўскі, каларыст, будучы прэзідэнт Латышскай акадэміі мастацтваў Пурвіт, грэк Хімона, што ўвекапомніў знакі сваёй Радзімы, — пабольшвае годнасць рускай мастацкай школы.

Яркія і разнастайныя па сваім мысленні (ад рэалізму, рамантызму і неакласіцызму да сімвалізму), у большасці ўсе яны працавалі ў рэчышчы краявіду. «Не зусім рускія» вучні-гадаванцы «не зусім рускага» настаўніка-самавука, былі паяднаныя агульным уяўленнем і разуменнем натуры, прыгажосці як унутранай сутнасці. Еднасць іх мацавалася яшчэ і гэтым эфемерным «не зусім», ценямі пачуцця «іншасці». Для Куінджы сімвалам цуду, містычным адлюстраваннем трансцэндэнтных сілаў былі горы. Індывідуальна пераасэнсаваныя горы прэвалявалі ў творчасці большасці вучняў.

Не варта спяшацца пагадзіцца з меркаваннямі расійскіх і польскіх мастацтвазнаўцаў пра суцэльнае дамінаванне ў Рушчыца «пансіхізму» ва ўспрыманні прыроды. Немажліва феномен мастака звесці і да ўплыву бёклінаўскай школы, уплыву расійскага сімвалізму на творчасць мастака-рэаліста. Самабытнасць майстра ў большай ступені абумоўлена светапоглядна глебай.

## Прызнанне

Узімку 1899 года ў Варшаве з поспехам прайшла выстава нядаўняга студэнта Пецярбургскай акадэміі мастацтва. Культурны свет схамянуўся: «У друку загуло… Скрозь туман словаў праступала нейкае дзіва. За адну ноч невядомы мастак становіцца з'явай, імя Рушчыца… разнеслася па ўсёй Польшчы», — згадваў мастак Караль Ціхі.

Цалкам сфармаваны творца паказаў свае краявіды. Ужо падзея! У тагачасным польскім мастацтве краявід не дамінаваў у жанравай палітры з-за такіх пазамастацкіх фактараў, як нацыянальна-вызваленчыя ідэі і патрыятычная скіраванасць, якія спрыялі актуалізацыі іншых жанраў. Работы мэтраў — Станіслаўскага, Падкавінскага, Камоцкага ды іншых панарамна ахоплівалі натуру, выклікалі пачуццё шырыні абсягаў, дужага краю і скіроўвалі да патрыятычных роздумаў. Не больш. Зрэдку «партрэты натуры» насычаліся немудрагелістымі жанравымі сцэнамі — воз сена, выбіранне бульбы ці яшчэ нейкімі падкрэслена настальгічнымі этнапрыкметамі.

Творы Рушчыца, што не вызначыш як краявіды (хутчэй карціны), уразілі ўсім: новым поглядам, новым бачаннем, новым разуменнем. Блізкія да камерных, кампазіцыйна разнастайныя, напісаныя са скарыстаннем прамой перспектывы. Уяўлялі яны погляд зблізку, без «шырыні ахопу», без пафасна-гераічнага надрыву і закладалі чысціню тэматычна-музычнага тону беларускіх мастакоў наступных пакаленняў. Паэтызацыя выяваў не надта значных пабытавых аб'ектаў — млын, дом, мост, дрэвы, яблыні, зямля, аблокі — паўставалі натуральна, проста, сціпла і ўвекапомнявалі знакі, этнічныя архетыпы быцця Краю. Каліва Сусвету, у якім прысутная Душа.

Прызнанне не завіхурыла, не збіла з панталыку. У 1898 годзе Фердынанд вяртаецца на сталае жыццё да ўласнага кавалку зямлі ў багданаўскае «роднае гняздо», дзе «стасункі паміж людзьмі больш натуральныя, каб у спакоі, нават пэўнай апатыі, аднавіць раўнавагу». У Багданава ды яго ваколіцах за якія дзесяць гадоў была створана большасць ягоных лепшых твораў.

Блукаючы па наваколлі, займаючыся гаспадарчымі клопатамі, робячы алоўкавыя накіды ці працуючы над эцюдамі, эскізамі, ён асэнсоўвае шлях свайго краю. Лёс сям'і. Прызначэнне чалавека. Прагаворвае дзённіку сваю мару: «Быць добрым сынам сваёй Айчыны, для яе працаваць, араць, і калі выспее што-небудзь, аддаць ёй у дар усе здабыткі. Таму што люблю яе ўсім сэрцам і толькі ёй належу целам і душой». Імпульсы, што працінялі яго на гэтай зямлі і пад гэтым небам, набывалі эстэтыка-філасофскую завершанасць і ўвасабляліся на палатне.

## Сюжэт

Ад краю да краю напоўніцу дыхае, дыбіцца гурбамі камлюкаватая, апрытомнеўшая ад зімовай сцюжы зямля. Асязальна ўвекапомнены кругагляд Сусвету — ралля. Гэты сапраўдны, трывалы грунт жыцця ахоплівае частку жыццёвай прасторы, па над якой суцэльна пануе Неба. Бязмежнае і спрадвечнае, сіняе да болю ў вачах і блакітна-лагоднае адначасова, яно перапаўняе прастору і рвецца вонкі. Вірыць «барочнымі» аблокамі, адухоўленая бялюткасць якіх — супрацьвага рэалістычна-матэрыяльнай зямлі. На гледача з нетраў небакраю павольна сунуцца магутна-грувасткія істоты, здатныя перакуліць зямлю дагары, — валы. Налягаючы на плуг, следам рушыць па ворыву постаць аратая…

Чалавек — масток між Небам і Зямлёй — сваёй прысутнасцю нябачным чынам нітуе і ўраўнаважвае боскія супрацьлегласці. Касмічныя акорды вясны і абуджэння, акорды еднасці ўсяго існага поўняць сэрца пачуццямі шчыра-малітоўнымі, нараджаюць мелодыю з простымі словамі народнай песні…

Мажорна-свежы твор «Зямля» быў напісаны Рушчыцам увосень, напярэдадні зімы 1898 года, і стала экспануецца на асобнай сцяне ў Нацыянальным музеі ў Варшаве.

* * *

Удзельнікі мінскай вечарыны памяці ў Доме Ваньковічаў сустрэнуцца з творам, які выразна і эмацыйна перадае ідэю непарушнага адзінства Зямлі і Неба, вызначае ў сімволіка-алегарычнай форме галоўны кірунак чалавечага руху.

Спадзяемся, госці змогуць пазнаёміцца з забытай старонкай мастацкага жыцця Мінска — адной з першых выставаў у горадзе, зладжанай у 1911 годзе, сярод арганізатараў якой быў «неўтаймоўны» Фердынанд, і ўдзел у якой узяло каля трыццаці мастакоў. Змогуць скласці ўяўленне пра жыццё і творчасць мастака, яго выкладчыцка-арганізацыйную і грамадскую дзейнасць. Уявіць няпростыя стасункі мастака з беларускім адраджэнскім рухам пачатку XX стагоддзя. Апрача гэтага можна будзе дазнацца шмат цікавага з «музейнай легенды» карціны, пачуць гісторыю Касцёла Міхала Архангела, пабудаванага дзякуючы фундацыі Пятра Паца і ўвасобленага на палатне Рушчыца.

ВЫСТАВА

# ЮРЫ ПЭН У ЯКУБА КОЛАСА

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Выстава Юрыя Пэна стала першай з тых, якія музей Я. Коласа будзе ладзіць рэгулярна. Дом пісьменніка расчыніць дзверы для набыткаў як беларускіх музеяў, так і замежных.**

Пад экспазіцыю адведзены пакой старэйшага сына пісьменніка, Данілы Канстанцінавіча. «У нас заўсёды бракавала плошчы, — адзначыў старшы навуковы супрацоўнік музея Анатоль Трафімчык. — Музей маленькі, бо гэта дом Якуба Коласа. Паколькі пастаянна былі прапановы арганізаваць выставы, бачачы запатрабаванасць, мы адкрылі гэту выставачную залу. Яна стала ўпершыню задзейнічаная менавіта дзякуючы Пэну».

«Маё жыццё — карціны» — пад такой назвай будзе доўжыцца да 15 снежня выстава. Карціны прыехалі з Віцебскага мастацкага музея. І менавіта гэтыя творы яшчэ ні разу не бачылі ў Мінску. На 23 палотнах дэманструюцца партрэты і пейзажы. «Тут мы можам знайсці менавіта таго Пэна, якім яго ведаюць. З характэрнай творчай манерай. Карціны невялікія, але з таго разраду, калі кажуць, што малы залатнік, ды дарагі», — лічыць Анатоль Трафімчык.

А Нацыянальны гістарычны музей падрыхтаваў для гэтай выставы экспазіцыю паштовак. На іх адлюстраваныя віцебскія краявіды пачатку XX стагоддзя. Нагадаем, што вучнямі Юрыя Пэна былі вядомыя майстры, сярод якіх і мастак Марк Шагал.

«Нам хацелася пачаць высокім мастацтвам, — адзначыла дырэктар музея Зінаіда Камароўская. — І каб менавіта гэта выстава была пачаткам цудоўнай серыі мастацкіх экспазіцый. Карціны вельмі падыходзяць да нашай невялікай плошчы. А паколькі гэта дом Коласа, то мы стараемся любую выставу стварыць ва ўтульнай хатняй атмасферы».

Музей Я. Коласа шмат экспанаваў на Віцебшчыне. Не толькі ў музеях Віцебска, але і Оршы, Полацка.

Якуб Колас некалі шмат дапамагаў людзям. У тым ліку станавіцца на ногі таленавітай моладзі. Сярод іх і скульптару Заіру Азгуру. Пакуль той вучыўся ў Віцебскай мастацкай вучэльні, Колас дапамагаў яму матэрыяльна. Як і яшчэ аднаму навучэнцу гэтай установы, Івану Лабкоўскаму. «У нас маецца вельмі шмат квіткоў пераводаў грошай, якія ён пералічваў людзям нават незнаёмым, якія папросту звярталіся да яго адрасу пасля вайны. Цяпер такіх мецэнатаў вельмі цяжка знайсці», — сказала Зінаіда Камароўская.

Да новага года музей зладзіць яшчэ і выставу календароў. Якуб Колас, дарэчы, вельмі іх любіў. Свае выставы ўжо прапанавалі шмат якія музеі, у тым ліку і з Украіны. Музей Я. Коласа будзе адкрываць і свае фонды, і прымаць гасцявыя выставы.

РЭЦЭНЗІЯ

# ЗАЛАТАЯ ЛЕТУЦЕННІЦА

Андрэй КРЫНІЦЫН

**Юбілейны мультфільм Дыснея «Рапунцэль» — аптымістычная музычная казка для ўсёй сям'і. Тры зорачкі з пяці.**

Студыя Уолта Дыснея, што выпусціла 50-ы паўнаметражны мультфільм, працягвае апрацоўку казачнай класікі. Гэтым разам у прыгоды ўляпалася не самая знакамітая прыгажуня «Рапунцэль». Дзяўчына была вядомая аграмаднай касой і змрочна-самотным жыццём у еўрапейскай вежы. Амерыканцы надалі сумнай казцы золата і свята.

Рапунцэль — зухаватая летуценніца з баявой патэльняў у руках і чароўнай касой, што свеціцца ды вяртае маладосць. Гераіня прагне вырвацца ў свет — пабегаць пад сонцам. Свецяцца ў небе ліхтарыкі, што лётаюць у небе ў дзень нараджэння Рапунцэль (дзяўчына не ведае, што яна — залатая прынцэса, скрадзеная інтрыганкаю).




Свецішча карона, якую сцягнуў прыгажун Флінт. Свецяцца ад радасці пацешныя разбойнікі, якія спяваюць пра свае мары. Свецяцца ад гонару забаўны конь Максімус.

Для анімацыі залатых валасоў была створаная адмысловая праграма, а свята ліхтарыкаў — найчароўная сцэна ў фільме. І на галівудскай фабрыцы ёсць месцейкі, дзе ззяюць ад шчасця.

ПРЭМ'ЕРА

# ПАДАРУНАК ГЕНІЯМ

Аляксей ХАДЫКА

**Напрыканцы лістапада ў малой зале імя Рыгора Шырмы Беларускай дзяржаўнай філармоніі ў рамках XIX Фестывалю «Адраджэнне беларускай капэлы» прагучала прэм'ера новай праграмы ансамбля салістаў «Класік-Авангард» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Байдава.**

Пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь узнік музычна-літаратурна-мастацкі праект у гонар 80-годдзя Уладзіміра Караткевіча. Чыталіся вершы нашага класіка-сучасніка, гучала музыка С. Манюшкі, В. Кузняцова, Г. Гарэлавай, С. Бельцюкова, А. Янчанкі і самога Байдава.

Аўтарам сцэнарыя праграмы выступіла Ірына Дубянецкая, і як заўсёды ўвасобленыя ёй ідэі былі прадстаўлены ў вытанчана-прадуманай гарманічнай форме. Вельмі пасавала падзеі падрыхтаваная непасрэдна ў малой зале выстава кніг і сямей-




ных фотаздымкаў Караткевіча. А пачалася праграма з адкрыцця ў дольным фае філармоніі мастацкай выставы карцін Яўгена Куліка і скульптур Геніка Лойкі. Цвет мінскай інтэлігенцыі слухаў успаміны сябры Караткевіча прафесара Адама Мальдзіса і прывітанні мастацкага кіраўніка праекта, нязменнага лідэра «адраджэння капэлы» Віктара Скарабагатава.

Трэба адзначыць, што праграма была пабудавана Ірынай Дубянецкай вельмі эстэтна. У «вершавых» перапынках з праектара на экран выводзіліся паэтычныя словы і выявы адпаведных кожнай тэматычнай частцы рэлігійных карцін.

Што вельмі ўражвае, ансамбль салістаў «Класік-Авангард» выдае па некалькі прэм'ерных праграм за канцэртны сезон. 11 снежня ў той жа малой зале філармоніі а 19-й гадзіне наўдагон сыходу незабыўнага і шчодрага на шапэнаўскія імпрэзы юбілейнага года Шапэна прагучыць спецыяльная канцэртная праграма. Яна складзена з твораў кампазітара, які займеў шанаванне не толькі на радзіме, але і ва ўсім свеце. Развітальны жэст, развітальны канцэрт напрыканцы юбілейнага, абвешчанага на Беларусі, года Шапэна.

Запрашаем нашых чытачоў ацаніць майстэрства маладых піяністаў Аляксандра Музыкантава, Васіля Нетука, Кацярыны Марэцкай, Кацярыны Матох. У праграме канцэрта 11 снежня «Варыяцыі на тэму В.А. Моцарта "Дон Жуан"», «Фантазія на тэмы папулярных польскіх твораў», «Кракавяк», Вялікае канцэртнае ронда, «Вялікі бліскучы паланэз». Праграму вядзе Святлена Немагай.

КАНЦЭРТ

# РЭАКТАРНЫ MYSLOVITZ

Аляксей ХАДЫКА

**Гурт з Польшчы «Myslovitz», які разбіў сэрцы ўсіх музычных фанатаў на эксклюзіўным канцэрце ў клубе «Рэактар» 3 снежня, мае цікавы двухсэнсоўны назоў. Своеасаблівае спалучэнне ў адным слове двух польскіх слоў: паляўнічы («мыслівец») і мысляр. Атрымліваецца паляванне на асоб, якія здольныя думаць, успрымаючы музыку.**

Іх музыка сапраўды аказалася інтэлектуальнай, і, што прыемна, успрымальнай беларускай моладдзю, якая з задавальненнем «каўбасілася» спачатку пад спевы Піта Паўлава, які і заманіў палякаў у Беларусь, а потым — цэлыя дзве гадзіны — пад хэдлайнераў канцэрта. Што гэта было? «Pink Floyd»? «Radiohead»? «Rammstein»? Усяго патроху у адным флаконе…

Мне ўдалося дамовіцца з музыкамі на эксклюзіўнае інтэрв'ю, якое адбылося раніцай 5 снежня ў гатэлі «Беларусь» на 22-м паверсе,




на фоне краявідаў нашай сталіцы. А 4 снежня польскія госці з Пітам Паўлавым наведвалі Нясвіж, захапляючыся прыгажосцю засыпанага снегам замка ў промнях снежаньскага сонца.

«Мы ў захапленні ад тых людзей, якіх сустрэлі ў Беларусі і, у прыватнасці, на канцэрце. Да таго ж у клубе «Рэактар» аказалася нечакана добрая апаратура, што дазволіла нам паказаць усе нашы магчымасці. Але ж самае галоўнае — файныя аматары музыкі, якія стварылі асаблівую атмасферу! Кожны мастак, актор або музыка выкладаецца на максімуму менавіта тады, калі адчувае водгук на ўласны творчы парыў. Асабліва — музыкі. Здаецца, мы даўно так добра не гралі», — гаворыць лідэр гурта, заснаванага ў 1992 годзе вакалістам і гітарыстам Артурам Роекам, гітарыст Войтэк.

Да размовы далучаецца клавішнік Пшэмыслаў: «Мы склалі спецыфічную і даволі складаную праграму. Пачалі і скончылі яе псіхадэлічнымі філасофскімі кампазіцыямі. А людзі не спужаліся і ўсё зразумелі! Мы папросту трапілі на цудоўную публіку. Тры дні таму ў Стакгольме, дзе мы гралі ў прэстыжным клубе «DEBEASER», прыём быў трошкі па-скандынаўску халаднаваты. Перад тым мы мелі выдатны кантакт са слухачамі на канцэрце ў Лондане, таксама ў знакавым клубе «SHEPHERDS BUS EMPIRE». Але ж у Лондане нас прыйшлі паслухаць палякі-эмігранты. Безумоўна, і ў «Рэактары» было нямала палякаў, аднак абсалютную большасць складалі беларусы. Але адчуванне, калі мы стаялі на сцэне, складалася такое, быццам мы на радзіме».

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1264

Падпісана да друку 10.12.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.